МЫ БУДУЕМ СВАЮ ДЗЯРЖАВУ, АБАПІРАЮЧЫСЯ НА НОРМЫ КАНСТЫТУЦЫІ

Паважаныя суайчыннікі!

Сардэчна віншую вас з Днём Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Асноўны закон, які з'яўляецца адным з сімвалаў беларускай дзяржаўнасці, стаў фундаментам сістэмы палітычных, эканамічных і сацыяльных адносін, зацвердзіў прынцыпы канстытуцыйнага ладу, замацаваў правы, свабоды і абавязкі грамадзян.

Абапіраючыся на нормы Канстытуцыі, мы будуем сваю суверэнную сацыяльную прававую дзяржаву, якая забяспечвае грамадзянскі мір і стабільнасць.

Спакой і бяспека, адукацыя і здароўе нацыі, дастойны ўзровень жыцця і камфортныя ўмовы пражывання прызнаны нашымі прыярытэтнымі задачамі. Упэўнены, што дзякуючы адзінству і мудрасці народа мы здольны дасягнуць намечаных мэт.

У гэты святочны дзень жадаю вам добрага здароўя, шчасця і дабрабыту.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

14 САКАВІКА 2015 г. СУБОТА № 49 (27907) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Пад мірным небам, у добрай згодзе

У нашай краіне ўдаецца захоўваць міжканфесійны мір і ўзаемаразуменне

Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з Дзяржаўным сакратаром Ватыкана кардыналам П'етра Паралінам, паведамляе БЕЛТА.

Фота БЕЛТА.

Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з П'етра Паралінам перадаў у дар Папе Рымскаму Францішку рукатворны абраз «Беззаганнае сэрца Марыі».

«Мая палітыка ў гэтых адносінах, палітыка ўсёй нашай дзяржавы грунтуецца на адным тэзісе: кожны чалавек мае права знайсці сваю дарогу да Бога, да храма, да якога ён лічыць патрэбным прыйсці. Гэта яго святое права, ніхто не мае права гэтаму процідзейнічаць. Мы спыняем усякія спробы стварыць перавагу той ці іншай канфесіі за кошт другой і гэтым самым дэстабілізаваць міжканфесійнае становішча ў Беларусі», — сказаў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што ў плане міжканфесійнага супрацоўніцтва сітуацыя ў Беларусі характарызуецца абсалютным мірам і ўзаемаразуменнем. «І што граху таіць, мы гэтым ганарымся», — адзначыў Прэзідэнт. Паводле яго слоў, у Беларусі жывуць прадстаўнікі амаль 30 канфесій, найбуйнейшымі з якіх з'яўляюцца праваслаўная і каталіцкая. «І ад іх у многім залежаць той міжканфесійны мір і супрацоўніцтва, якія існуюць у Беларусі, іх роля неацэнная», — лічыць кіраўнік беларускай дзяржавы.

За апошнія 20 гадоў у Беларусі колькасць каталіцкіх прыходаў павялічылася амаль у чатыры разы, дзяржава перадала больш за 300 будынкаў і культавых збудаванняў. Паводле слоў Прэзідэнта, забяспечанасць католікаў храмамі ў Беларусі складае 98 працэнтаў. «Такой забяспечанасцю культавымі будынкамі ніводная іншая канфесія ў Беларусі не валодае, і за мяжой, напэўна, у Ватыкана такі паказчык цяжка знайсці», — сказаў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу і на такі момант, як падрыхтоўка каталіцкіх святароў, адзначыўшы жаданне мець у Беларусі больш мясцовых каталіцкіх свяшчэннаслужыцеляў. «Мы не пераводзім вырашэнне гэтай праблемы ў плоскасць выключна Ватыкана. Мы разумеем, каб мець святароў-католікаў беларускага паходжання, трэба іх проста рыхтаваць у Беларусі», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён дадаў, што яго ініцыятывай было будаўніцтва ў Беларусі адукацыйнай акадэміі.

«Ёсць шэраг пытанняў, але не праблем, якія мы можам вырашыць нават сёння, і гэта будзе на карысць усёй каталіцкай абшчыне і беларускаму грамадству», — падкрэсліў Прэзідэнт.

У сваю чаргу Дзяржаўны сакратар Ватыкана кардынал П'етра Паралін перадаў прывітанне Папы Рымскага. Дзяржсакратар адзначыў, што мэтай яго візіту з'яўляецца развіццё кантактаў з органамі дзяржаўнага кіравання Беларусі. «Рады чуць словы высокай ацэнкі ролі каталіцкай абшчыны, якую яна адыгрывае ў жыцці краіны», — сказаў кардынал.

Учора прадстаўнік Ватыкана правёў сустрэчы з Патрыяршым Экзархам усяе Беларусі, мітрапалітам Мінскім і Заслаўскім Паўлам, міністрам замежных спраў Уладзімірам Макеем, прэм'ер-міністрам Андрэем Кабяковым.

Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл Мясніковіч, прымаючы П'етра Параліна, адзначыў: «Я хацеў бы таксама выказаць пажаданне, каб ваш візіт на вышэйшым узроўні паспрыяў таму, каб адбыўся візіт галоўнага іерарха — Папы Рымскага Францішка да нас у Беларусь. Гэта быў бы вельмі добры знак як у рамках двухбаковых, так і міжканфесійных адносін».

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Мінчанка Людміла Солаб-Галаватая і яе сямёра дзяцей.

ШЧАСЦЕ Ў СЁМАЙ СТУПЕНІ

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір ДАМАНЕЎСКІ, старшыня Магілёўскага аблвыканкама:

«Работа прадстаўнікоў выканаўчай улады са зваротамі грамадзян будуецца на пошуку аптымальнага для абодвух бакоў выхаду з праблемных сітуацый, і кампраміс павінен быць асновай вырашэння пытанняў, што хвалююць насельніцтва. Многія з іх, якія тычацца работы з людзьмі, вельмі тонкія, да іх нельга ставіцца павярхоўна, пад наплывам эмоцый, праз недахоп сіл і часу прымаць рашэнні на хаду, пакідаць без увагі. Дыпламатычная і адкрытая размова з насельніцтвам, уменне ўважліва выслухаць, правільна і аргументавана растлумачыць праблемныя моманты, своечасова прыняць неабходныя меры — галоўныя элементы паспяховай кіраўніцкай дзейнасці».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.03.2015 г.

Долар ЗША	15060,00	▼
Еўра	15950,00	▼
Рас. руб.	246,00	▼
Укр. грыўня	698,84	▲

■ Родныя людзі

БАЦЬКІ І ДЗЕЦІ: ВЕРСІЯ XXI

18 працэнтаў пастаяльцаў дамоў састарэлых маюць працаздольных дзяцей, а кожнае дзясятае забойства ў краіне — з боку дарослага дзіцяці ў дачыненні да пажылых бацькі ці маці

Сёння кожны чацвёрты беларус — пенсіянер. І штогод колькасць пажылых грамадзян толькі расце: агульнаеўрапейская тэндэнцыя старэння насельніцтва не абмінула і нашу краіну. Таму на дзяржаўным узроўні пытанні пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага абслугоўвання — адны з прыярытэтных. А што робіцца самімі дзецьмі, каб падтрымаць бацькоў? Усё часцей сутыкаемся з тым, што неадзінокіх старых збываюць у дамы-інтэрнаты, пакідаюць даглядаць медыкам і сацработнікам. А ў стужцы навін перыядычна з'яўляюцца жахлівыя паведамленні пра жорсткія забойствы ці здзекі з пенсіянераў у сем'ях. Чаму дарослыя людзі адмаўляюцца клапаціцца пра сваіх бацькоў і як павысіць адказнасць працаздольных дзяцей? Паразважаць на гэту надзвычай актуальную для грамадства тэму мы запрасілі начальніка ўпраўлення стацыянарных устаноў сацыяльнага абслугоўвання і капітальнага будаўніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Марыю ГАРБАЦЭВІЧ, кансультанта-ўрача аддзела стацыянарных устаноў сацыяльнага абслугоўвання таго ж упраўлення Жанну КОЦІК, намесніка старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Святлану ШЫЛАВУ, намесніка начальніка ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Барысаўскага райвыканкама Аляксандра БАРАДАЎКУ, начальніка ўпраўлення прафілактыкі Галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі МГБ МУС падпалкоўніка міліцыі Алега КАРАЗЕЯ, галоўнага ўрача Гарадскога цэнтра здароўя Мінска Івана ТАРАШКЕВІЧА і кіраўніка Цэнтра беларускай драматургіі Аляксандра МАРЧАНКУ.

СТАР. 5

■ Ахова здароўя

МЕДЫЦЫНА ЗАЎТРАШНЯГА ДНЯ

У апошнія гады мы з зайздросным пастаянствам трапляем у 50 найлепшых краін, дзе на высокім узроўні арганізавана вядзенне цяжарнасці і родаў пры адпаведнай забяспечанасці кваліфікаванымі работнікамі. Па комплексным паказчыку дзіцячай і мацярынскай смяротнасці Беларусь займае 4-е месца ў свеце. Доступ да паслуг па ахове рэпрадуктыўнага здароўя ў нас такі ж, як у Францыі або Фінляндыі.

Фота БЕЛТА.

Наогул, паводле высноў Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, даступнасць медыцынскай дапамогі ў Беларусі адна з найлепшых — як у Брунеі і Канадзе. Дзякуючы ў тым ліку гэтаму аспекту, у нас зніжаецца каэфіцыент агульнай смяротнасці, трэці год запар ва ўсіх рэгіёнах захоўваецца тэндэнцыя зніжэння колькасці памерлых у працаздольным узросце. У Мінску і Брэсцкай вобласці летась зафіксаваны прырост насельніцтва. Днямі **міністр аховы здароўя Беларусі Васіль ЖАРКО** прывёў самыя важныя факты аб сітуацыі з захваральнасцю ў мінулым годзе і далейшым развіцці айчыннай медыцыны.

ШКОЛЬНЫЯ ХВАРОБЫ

Самыя распаўсюджаныя — парушэнне постаці, зроку, функцыянальныя парушэнні стрававання, кровазвароту і нервовай сістэмы.

Сярод дашкольнікаў 1-ю групу здароўя маюць 32 працэнты, 4-ю (наяўнасць інваліднасці) — 1,3. Сярод падлеткаў 1-ю групу маюць ужо толькі 26 працэнтаў, 4-ю —1,8.

Паказчык павышанай масы цела ў дзяцей (ад 0 да 17 гадоў) складае 5,9 выпадка на 1000 дзяцей (а ў 2008-м ён быў 4,6).

Каля 15 працэнтаў дзяцей ад усіх памерлых ва ўзросце да 5 гадоў і каля 70 працэнтаў 15-19 гадовых гінуць з так званых знешніх прычын (утапленняў, траўмаў, выпадковых атручэнняў і г.д.).

РЭГІЁНЫ ПАДЦЯГВАЮЦЦА

Летась праведзена звыш 14 тысяч кардыяхірургічных умяшанняў, у тым ліку каля 3 тысяч — на адкрытым сэрцы.

РНПЦ «Кардыялогія» працягвае дзяліцца вопытам з рэгіёнамі, дзе выконваецца ўжо звыш 70 працэнтаў усіх аператыўных умяшанняў.

Практычна ліквідаваная патрэба накіравання пацыентаў з сардэчна-сасудзістай паталогіяй на лячэнне за мяжу.

Упершыню за апошнія два дзесяцігоддзі дасягнута зніжэнне агульнай колькасці захворванняў сістэмы кровазвароту.

У РНПЦ «Неўралогія і нейрахірургія» няма чэргаў на кансультатыўны прыём (у кансультатыўна-поліклінічным аддзяленні), на правядзенне аператыўных умяшанняў, шпіталізацыю ў нейрахірургічнае аддзяленне і дзіцячае неўралагічнае аддзяленне. Чарга на планавую шпіталізацыю ў неўралагічнае аддзяленне не перавышае 4-5 тыдняў.

СТАР. 3

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Насельніцтва Цэнтральнай Еўропы і Балтыі імкліва старэе

Пра гэта паведамляе Цэнтр навін ААН. Эксперты Сусветнага банка адзначаюць, што старэнне насельніцтва — агульная для ўсёй Еўропы тэндэнцыя, звязаная шмат у чым з павелічэннем працягласці жыцця. Аднак насельніцтва Цэнтральнай Еўропы і Балтыі старэе яшчэ і па прычыне зніжэння нараджальнасці і міграцыі моладзі. Так, у Польшчы, Венгрыі і Славакіі паказчык нараджальнасці значна ніжэйшы, чым у заходніх дзяржавах, і складае ўсяго 1,3 дзіцяці на адну жанчыну. Спецыялісты адзначаюць, што многія маладыя людзі пакідаюць свае краіны ў пошуках працы і лепшага жыцця за мяжой. Спецыялісты Сусветнага банка рэкамендуюць урадам краін надаваць больш увагі здароўю насельніцтва, якое старэе, падымаць узровень мінімальных заробкаў і пенсій, не дапускаць «уцечкі мазгоў» і стымуляваць павышэнне нараджальнасці.

Deutsche Bank прадказаў падзенне еўра да 85 цэнтаў

Да 2017 года еўра ўпадзе ў адносінах да долара да 85 цэнтаў, прагназуюць аналітыкі Deutsche Bank Робін Уінклер і Джордж Саравелас. Эксперты лічаць, што ўжо да канца гэтага года еўра дасягне парытэту з доларам, у 2016 годзе будзе каштаваць 90 цэнтаў, а да 2017 года патаннее да 85 цэнтаў. Асноўнай прычынай падзення еўра ў адносінах да долара, паказваюць Уінклер і Саравелас, з'яўляецца павелічэнне адтоку капіталу з Еўропы, які да 2017 года можа дасягнуць € 4 трлн. За апошнія шэсць месяцаў ён перавысіў € 300 млрд. Капіталы выцякаюць з Еўропы з-за адмоўных ставак і праграмы колькаснага змякчэння ЕЦБ. Большасць сродкаў пайшла ў ЗША, Вялікабрытанію і Канаду. «Спалучэнне празмерных зберажэнняў і структурна нізкай прыбытковасці можа прывесці да таго, што ўвесь еўрапейскі кантынент будзе па-ранейшаму асноўнай крыніцай глабальных дысбалансаў для канца гэтага дзесяцігоддзя», — заключылі эксперты Deutsche Bank.

Ісландыя адклікала заяўку на ўступленне ў Еўрасаюз

Ісландыя адклікае заяўку на ўступленне ў Еўрасаюз і не будзе аднаўляць перамовы, якія былі распачаты чатыры гады таму папярэднім урадам, абвясціў МЗС астраўной дзяржавы.

«ЕС і Ісландыя абмеркавалі ісландскую пазіцыю па пытанні аб статусе пададзенай раней заяўкі на ўступленне ў Еўрасаюз. Урад не мае намеру аднаўляць працэс падрыхтоўкі да ўступлення ў ЕС», — заяўляе знешнепалітычнае ведамства. Кіраўнік МЗС краіны Гунар Брагі Свейнсан выклаў пункт гледжання ўрада Ісландыі Эдгарсу Рынкевічу — міністру замежных спраў Латвіі, якая цяпер старшынствуе ў Савеце ЕС. Падчас сустрэчы кіраўнік ісландскай дыпламатыі таксама перадаў калегу ліст, у якім адзначаецца, што дзейны ўрад цалкам адмаўляецца ад планаў сваіх папярэднікаў у галіне еўраінтэграцыі, больш не лічыць Ісландыю краінай-кандыдатам на далучэнне да Еўрасаюза і заклікае супольнасць зыходзіць з гэтага факта. Эксперты адзначаюць, што ў дадзены момант еўраінтэграцыя нявыгадная для краіны, перш за ўсё па той прычыне, што ўступленне ў ЕС нанясе моцны ўдар па рыбалавецкай галіне і фермерскім гаспадаркам. Апытанні грамадскай думкі таксама стабільна паказваюць, што большая частка 320-тысячнага насельніцтва Ісландыі выступае супраць еўраінтэграцыі.

КОРАТКА

Аграрыі Брэсцкай, Гомельскай, Гродзенскай і Мінскай абласцей пачалі сяўбу ранніх яравых культур. Усяго ў гэтым годзе ранніміяравымі плануецца засеяць 1 млн га.

У Беларусі вучэбныя аўтамабілі, старэйшыя за 5 гадоў, будуць праходзіць тэхагляд кожныя паўгода. Да гэтага часу яны праходзілі тэхагляд як звычайны легкавы аўтамабіль.

Па выніках 2014 года прафіцыт бюджэту сектара дзяржаўнага кіравання склаў Br8,4 трлн, або 1,1 працэнта ВУП, рэспубліканскага бюджэту — Br5,4 трлн, або 0,7 працэнта ВУП, за кошт дадаткова паступіўшых даходаў і эканоміі ў расходах.

З-за пераносу рабочых дзён у сувязі з Радаўніцай работа прыгарадных маршрутаў у Мінску будзе арганізавана па наступным графіку: 18 красавіка — па графіку суботы; 19 красавіка — па графіку нядзелі; 20 красавіка — па графіку суботы; 21 красавіка — па графіку нядзелі; 24 красавіка — па графіку пятніцы; 25 красавіка — па графіку пятніцы.

Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі з 13 сакавіка знізіла ў сярэднім на 2,4 працэнта мінімальныя рэкамендуемыя экспартныя цэны на ялавічыну I катэгорыі.

■ Узровень

Новы «Дакар» — новы рухавік

Мінскі аўтамабільны завод ужо пачаў падрыхтоўку да гонак «Дакар-2016». Зусім нядаўна аўтамабілі, якія ўдзельнічалі сёлета ў спаборніцтвах, вярнуліся на радзіму. Але замест іх інжынеры ўжо распрацоўваюць новыя. Тэхрэгламент становіцца больш жорсткім, і яму трэба адпавядаць.

Нягледзячы на тое, што ўсе тры машыны дайшлі да фінішу і дапамаглі ўвайсці беларускай камандзе ў ганаровую дзясятку, згодна з новым рэгламентам яны становяцца непрыдатнымі для будучых спаборніцтваў.

Паводле слоў **першага намесніка генеральнага дырэктара «МАЗ» Валерыя ІВАНКОВІЧА**, вынік мінулых спаборніцтваў — самы лепшы за ўвесь час існавання каманды. Беларусь выступала на гонках «Дакара» ўжо чацвёрты раз і год ад года прагрэсуе ў заваяванні новых вяршынь.

«З-за цяжкай эканамічнай сітуацыі сёння складана знайсці фінансаванне. І, нягледзячы на гэта, ад утрымання спартыўнай каманды мы не адмаўляемся. Гэта частка нашага брэнда. Будзем збіраць сродкі на ўдзел у «Дакары-2016», — падкрэсліў Валерый Іванковіч.

Каб адпавядаць тэхнічным рэгламентам наступнага года, у першую чаргу неабходна мадыфікаваць рухавік.

Як патлумачыў **штурман СК «МАЗ-СПОРТАўто» Валерый КАЗЛОЎСКІ**, спецыялісты ўжо зрабілі даследаванне сярод вытворцаў і выбралі таго, хто можа прапанаваць рухавік, які б адпавядаў новым рэгламентам «Дакара-2016».

«Канструктарскія работы па стварэнні новага аўтамабіля ўжо ідуць поўным ходам. Плануецца, што ён будзе гатовы да сезона летніх гонак. Пасля дапрацоўкі новага аўтамабіля мы плануем стварыць яшчэ два, каб на «Дакар-2016» выйсці трыма машынамі», — расказаў Валерый Казлоўскі.

У першую чаргу плануецца дапрацоўка падвескі і рулявога механізму. Новы аўтамабіль стане лягчэйшым і спрытнейшым. Глядзіш, і да перамогі дамчыць.

Ілья КРЫЖЭВІЧ.

ISSN 1990 - 763X

Дробязяў у вялікай справе не бывае

Не толькі вялікія, але малыя і сярэднія прадпрыемствы павінны мецца на ўвазе, калі размова ідзе аб прамысловай палітыцы краіны. Такую думку выказаў Міхаіл Мясніковіч, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, падчас рабочага візіту ў Маладзечанскі раён.

Спікер верхняй палаты парламента наведаў ААТ «Беразінскае» разам з генеральным дырэктарам ЗАТ «Атлант» Віктарам Шумілам. У аднайменным аграгарадку сёння гэтае цалкам самаакупнае прадпрыемства яшчэ і дае работу большасці яго жыхароў. Каля 80% прадукцыі — камплектуючыя для халадзільнікаў «Атлант».

«Часта, калі мы гаворым аб прамысловай палітыцы, чамусьці арыентуемся на нашы буйныя прадпрыемствы», — адзначае парламентарый. Міхаіл Мясніковіч лічыць, што асобную ўвагу трэба надаваць у тым ліку малым і сярэднім вытворчасцям. «Вельмі добра, што большасць гэтых прадпрыемстваў мае цесныя кааперацыйныя сувязі з нашымі прамысловымі гігантамі», — сказаў ён.

Міхаіл Мясніковіч наведаў і адну з кампаній холдынга «Забудова». Старшыня Савета Рэспублікі месяц таму ўжо быў на ім, але цяпер адзначыў, што значных змен не адбылося. І хоць прадпрыемства мае рэзерв, але не да канца яго выкарыстоўвае.

Адказваючы на пытанні журналістаў, парламентарый таксама расказаў пра магчымасць стварэння валютнай кааперацыі ў межах Еўразійскага эканамічнага саюза. Ён патлумачыў, што гэта адна з апошніх фаз развіцця інтэграцыі. Значыць, яна прыпадзе на 2024 год, і гэта, безумоўна, позна. «Мы павінны разглядаць пытанні аб адзінай плацежнай сістэме, аб павелічэнні долі нацыянальных валют ва ўзаемным разліку, набліжаючы гэтыя тэрміны». І беларускі бок, што старшынствуе сёння ў ЕАЭС, актыўна гэтаму садзейнічае.

Вераніка ПУСТАВІТ.

■ На слыху

Міхаіл ЖУРАЎКОЎ:

«ПРАБЛЕМА «КАМЕНДАНЦКАЙ ГАДЗІНЫ» — НАДУМАНАЯ»

«Ці не лічыце вы анахранізмам захаванне рэжыму пропуску ў студэнцкія інтэрнаты да 24 гадзін, і што перашкаджае зрабіць для жыхароў інтэрнатаў кругласутачны допуск?» — пацікавіліся студэнты ў міністра адукацыі Міхаіла ЖУРАЎКОВА падчас яго сустрэчы са студэнцкім прафсаюзным актывам, што прайшла на базе Белдзяржуніверсітэта.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Яшчэ раней студэнты ў сацыяльнай сетцы «УКантакце» стварылі адкрытую групу «Інтэрнаты 24 гадзіны», дзе размясцілі зварот да Міхаіла Жураўкоўва ад імя больш як 2 тысяч студэнтаў: «...Мы хочам канструктыўнага дыялогу, а не канфлікту. Калі ласка, адмяніце дзейныя абмежаванні на доступ у студэнцкія інтэрнаты ноччу... Авансам кажам «дзякуй!»

Студэнты сцвярджаюць, што ў многіх інтэрнатах дзейнічае забарона на кругласутачны ўваход у інтэрнат для тых, хто там пражывае. І калі студэнт не паспеў вярнуцца да пэўнага часу, то ён рызыкуе застацца на вуліцы. «Здаецца, няма такога чалавека, які жыў у інтэрнаце і ніколі пры гэтым не трапляў у сітуацыю, калі да зачынення дзвярэй некалькі хвілін, і ты як шалёны спрабуеш паспець дайсці, дабегчы, даляцець, тэлепартавацца да вахты своечасова. А самыя тыповыя прыклады: студэнт вымушаны правесці паўночы на вакзале з-за позняга цягніка альбо проста пад сценамі інтэрната халоднай раніцай пасля начной дыскатэкі і пусціць цябе ў цёплае памяшканне ці не — усё ўпіраецца ў прынцыповасць і чалавечнасць вахцёра ды тое, наколькі моцна ён спіць», — пішуць студэнты ў сацыяльнай сетцы. «А што рабіць тым, хто ў вячэрні час працуе?» — пытаюцца яны ў кіраўніка ведамства.

Міністр адукацыі Міхаіл Жураўкоў лічыць праблему так званай «каменданцкай гадзіны» ў студэнцкіх інтэрнатах надуманай.

— Студэнтаў пускаюць у інтэрнаты і пасля 12 гадзін ночы; адзінае, што патрабуецца ад жыхароў інтэрната, — гэта праінфармаваць вахцёра пра тое, што яны будуць позна, і запісацца ў журнал, каб той ведаў, каго і калі чакаць, — тлумачыць Міхаіл Жураўкоў. — Гэта, на маю думку, нармальная практыка. Калі вы сыходзіце з дома і ведаеце, што вернецеся позна або ўвогуле не вернецеся начаваць, вы ж папярэджваеце пра гэта сваіх бацькоў? А на час вучобы ў іншым горадзе адказнасць за студэнтаў нясём мы, і, не прывядзі Бог, калі што-небудзь здарыцца з кім-небудзь з маладых людзей, як тады глядзець у вочы іх бацькам?

Што вы прапануеце: каб дзверы ў інтэрнат былі адчыненыя насцеж круглыя суткі? Каб туды мог увайсці бесперашкодна любы ахвотны? Напэўна, усё ж такі трэба прытрымлівацца нейкіх правілаў.

Мяркую, што некаторыя з тых, хто не хоча папярэджваць аб сваім познім вяртанні ў інтэрнат, ведаюць, што прыйдуць не зусім цвярозымі, і не жадаюць, каб іх бачылі ў такім выглядзе. А са студэнтамі, якія працуюць, я лічу, увогуле праблем не павінна быць. Як іх могуць не ўпусціць у інтэрнат, калі ведаюць, што чалавек працуе? Хіба што толькі справа ў каменданце, які такім чынам праяўляе або сваю залішнюю стараннасць, або хоча прадэманстраваць сваю ўладу...

«У такім разе ўсё ў вашых руках: выстаўляйце дзяжурыць па начах студэнтаў, якія будуць замест сну адчыняць/зачыняць дзверы сваім сябрам. Іншая справа — ці спадабаецца ім гэта? Няхай студэнцкі прафсаюз возьме інтэрнаты пад свой асабісты патранаж і прымае самы непасрэдны ўдзел у падтрыманні ў інтэрнатах парадку...», — прапанаваў прафсаюзным актывістам міністр.

Надзея НІКАЛАЕВА

■ З нагоды

ПАДМУРАК ПРАВАВОЙ СІСТЭМЫ

Значэнне Канстытуцыі ў любой дзяржаве такое вялікае, што сам факт яе прыняцця ацэньваецца як крок да дэмакратыі, да палітычнай і сацыяльнай стабільнасці

15 сакавіка 1994 года — гістарычная падзея для беларускага народа і яго дзяржавы. Яна адкрыла новую эпоху ў іх развіцці, стала сімвалам якаснага змянення беларускай дзяржаўнасці. У гэты дзень была прынята новая Канстытуцыя — Асноўны закон.

Канстытуцыя як найважнейшы палітыка-прававы дакумент, найвышэйшы акт народаўладдзя юрыдычна аформіла якасна новую сістэму дзяржаўнасці, палітычныя і сацыяльна-эканамічныя перамены, якія адбыліся ў дзяржаве і грамадстве. На думку Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі, Канстытуцыя «служыць надзейным арыенцірам дзяржаўнай палітыкі, накіраванай на стварэнне эфектыўнай эканомікі, забеспячэнне сацыяльнай абароны і дабрабыту насельніцтва, беражлівыя адносіны да традыцый і каштоўнасцяў беларускага народа». Яна адпавядае патрабаванням часу, патрэбам палітычнага, эканамічнага і сацыяльнага жыцця.

Замацаваныя ў Канстытуцыі прынцыпы і нормы гарантуюць стабільнасць канстытуцыйнага ладу і прававой сістэмы, закліканай ствараць умовы для існавання і належнага функцыянавання сацыяльных інстытутаў, забяспечваць правапарадак у грамадстве, цывілізаваныя адносіны паміж яго членамі. Адлюстроўваючы прынцыпы і палажэнні Канстытуцыі, прававая сістэма выступае ў якасці адной з найважнейшых і эфектыўных сістэм сацыяльнай інтэграцыі і сацыяльнага кіраўніцтва грамадскімі працэсамі і розных відаў дзейнасці.

Самай важнай арганічнай часткай прававой сістэмы, яе ядром з'яўляецца Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь. Валодаючы найвышэйшай юрыдычнай сілай, яна займае пануючае становішча ва ўсёй прававой сістэме, аказвае канстытуцыйнае ўздзеянне на ўсе яе элементы, з'яўляецца магутным праваўтваральным фактарам у працэсе прамога дзеяння яе нормаў, а таксама выступае ў якасці нарматыўнага і каштоўнаснага арыенціра ўсяго заканатворчага працэсу.

Нормы Канстытуцыі дзейнічаюць прама, непасрэдна, з'яўляюцца першаснымі, зыходнымі, асноватворнымі для ўсіх галін права, валодаюць вяршэнствам, найбольшай стабільнасцю, забяспечваючы ўстойлівасць палітычнага, эканамічнага і сацыяльнага жыцця. Канстытуцыя ўяўляе сабой адзіную прававую гарантыю забеспячэння стабільнасці прававой сістэмы, вызначае прынцыпы і межы яе развіцця.

Канстытуцыя складае падмурак ўсёй сістэмы заканадаўства, адыгрывае вызначальную ролю ў яе развіцці, прадугледжвае механізм прымянення нарматыўных прававых актаў у адпаведнасці з прынцыпам вяршэнства права (артыкул 7). Канстытуцыйная формула, якая прадпісвае выданне законаў, дэкрэтаў, указаў і іншых актаў дзяржаўных органаў на аснове і ў адпаведнасці з Канстытуцыяй (артыкул 137), вызначае жорсткую меру звязанасці паміж канстытуцыйнымі нормамі і палажэннямі прававых актаў, выступае няўхільным, найважнейшым патрабаваннем канстытуцыйнасці нарматворчай дзейнасці.

Канстытуцыя Беларусі замацавала якасна новы этап народаўладдзя, яго каштоўнасці, а таксама рэальную ўладу народа, пра якую стагоддзямі марылі вядомыя беларускія асветнікі і паэты. Народ як крыніца дзяржаўнай улады і носьбіт суверэнітэту ажыццяўляе сваю ўладу непасрэдна, праз прадстаўнічыя і іншыя органы ў формах і межах, вызначаных Канстытуцыяй. Такім чынам, Канстытуцыя з'яўляецца асновай і аб'ектыўнай мяжою дэмакратыі, за якую яна не можа выходзіць без шкоды для канстытуцыйна-прававой бяспекі.

Артыкул 1 Канстытуцыі змяшчае мадэль развіцця Рэспублікі Беларусь — унітарная дэмакратычная сацыяльная прававая дзяржава. Максімальнае набліжэнне да гэтай мадэлі, да «дасканалага» грамадства магчыма толькі праз захаванне ўсімі Канстытуцыі, фарміраванне якой адказвае яе сутнасці прававпрымяняльнай практыкі, забеспячэнне правоў і свабод грамадзян, добрасумленнае, адказнае выкананне апошнімі сваіх канстытуцыйных абавязкаў. У гэтай справе вельмі важная роля канстытуцыйнага кантролю, які ажыццяўляецца Канстытуцыйным Судом Рэспублікі Беларусь і спрыяе ўдасканаленню нацыянальнай прававой сістэмы, фарміраванню дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавы і ў першую чаргу — абароне правоў, свабод і законных інтарэсаў чалавека і грамадзяніна. Канстытуцыйны Суд у адным са штогадовых пасланняў аб стане канстытуцыйнай законнасці ў Рэспубліцы Беларусь адзначыў, што дэмакратыя і вяршэнства права — дзве ўзаемаабумоўленыя і ўзаемазвязаныя канстытуцыйныя каштоўнасці. З дэмакратыяй, заснаванай на Канстытуцыі, звязана рэалізацыя такіх канстытуцыйных каштоўнасцяў, як законнасць, роўнасць, справядлівасць, правы і свабоды чалавека.

Як вядома, Дэкрэтам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26 чэрвеня 2008 г. № 14 «Аб некаторых мерах па ўдасканаленні дзейнасці Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь» Канстытуцыйны Суд, нароўні з іншымі паўнамоцтвамі, надзелены паўнамоцтвам ажыццяўляць абавязковы папярэдні кантроль канстытуцыйнасці ўсіх законаў, прынятых Палатай прадстаўнікоў і адобраных Саветам Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, да падпісання іх Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. Пры ацэнцы канстытуцыйнасці нормаў законаў у парадку абавязковага папярэдняга кантролю Канстытуцыйны Суд выходзіць з прынцыпаў і нормаў Канстытуцыі, выяўленага канстытуцыйна-прававога сэнсу нормаў, якія правяраюцца, у тым ліку з улікам агульнапрызнаных прынцыпаў і нормаў міжнароднага права, што знаходзіць адлюстраванне ў яго прававых пазіцыях.

У 2008—2015 гадах у парадку абавязковага папярэдняга кантролю Канстытуцыйным Судом ажыццёўлена праверка канстытуцыйнасці 724 законаў, уключаючы шэсць кодэксаў.

За ўвесь перыяд сваёй дзейнасці Канстытуцыйным Судом прынята звыш 1200 рашэнняў, у тым ліку ўнесена ў дзяржаўныя нарматворчыя органы больш за 200 прапаноў па ўдасканаленні заканадаўства.

Наша Канстытуцыя змяшчае велізарны патэнцыял для фарміравання сапраўды народнай суверэннай дэмакратычнай прававой дзяржавы з канстытуцыйнай эканомікай, развіцця чалавека, усіх сфер жыццядзейнасці.

Надзеі і чаканні, спароджаныя Канстытуцыяй у нашай свядомасці, не заўсёды могуць рэалізавацца адразу і ў поўнай меры. Нягледзячы на гэта, усе мы адзіныя ў наступным: Дзень Канстытуцыі — гэта па сутнасці Дзень дэмакратыі, а роўна і Дзень суверэннай беларускай дзяржаўнасці.

Анатоль ЦІКАВЕНКА,
суддзя Канстытуцыйнага Суда Рэспублікі Беларусь

■ Не прапусціце!

УСЕ — У ЗААПАРК!

Сёння тут адкрываецца экзатарыум

У сталічным экзатарыуме — доме для экзатычных жывёл Паўднёвай Амерыкі — наведвальнікам прапануюць пазнаёміцца з новай экспазіцыяй «Арынока». Тут можна будзе ўбачыць унікальных малпаў, незвычайных рэптылій, экзатычных марскіх і прэснаводных рыб, трапічных птушак, а таксама млекакормячых і іншых цікавых жывёл.

Работнікі заапарка прапануюць гасцям акунуцца ў свет дажджавога трапічнага лесу. У экзатарыуме можна будзе паназіраць за жыццём самага буйнога грызуна на Зямлі — капібары — і дрэўнага дзікабраза, разгледзець анакондаў, кайманаў, іншых незвычайных рэптылій, экзатычных квакшаў і дрэвалазаў.

З 13-00 на сцэнічнай пляцоўцы для наведвальнікаў падрыхтавана канцэртная праграма «З наваселлем!». Падчас яе арганізатары абяцаюць сустрэчу з дамавіком Кузем, які пазнаёміць гасцей з новым павільёнам і яго насельнікамі. Святочны настрой будуць дарыць выканаўцы з поп-фольк-гурта «Лялькі Карпарэйшн», танцавальны калектыў «Гарэзлівыя агеньчыкі» прадэманструе гледачам бадзёрасць і маладую энергію, а акардэаніст-віртуоз Віталь Блага зачаруе выдатнай музыкай.

На цэнтральнай алеі размесяцца пляцоўкі «Горада майстроў», дзе спецыялісты навучаць ахвотных вырабляць сувеніры ў падарунак сваім родным і сябрам. Тут пройдуць майстар-класы па карвінгу (дэкаратыўная разьба па гародніне і садавіне), дэкаратыўнай вышыўцы, вырабе сувеніраў з тканіны і саломкі. Апроч таго, у заапарку можна наведаць выстаўку фларыстыкі, выставу-продаж сувеніраў і ўпрыгожанняў «Традыцыі і рамёствы», у гэты дзень працуюць атракцыёны «Пакой смеху» і «5D-кіно».

Фота БЕЛТА.

Малыя могуць пацешыцца катаннем на конях, набыць ласункі — папкорн, слойкі, напоі ў прадуктовых ларках на тэрыторыі заапарка. Таксама для гасцей супрацоўнікі падрыхтавалі салодкі пачастунак — дэгустацыю цукерак і марозіва.

У сувязі з адкрыццём новага павільёна з сённяшняга дня кошт уваходнага квітка ў заапарк будзе складаць 60 тысяч рублёў. Квіток у дэльфінарый «Нэма» з наведваннем экзатарыума абыдзецца ў 180 тысяч у будныя дні, 200 тысяч у выхадныя і святочныя. Білет у Дэльфінарый, набыты за 150 тысяч рублёў (у будныя дні) і 170 тысяч (у выхадныя і святочныя дні) не дае права бясплатнага наведвання экзатарыума.

Дзіяна СЕРАДЗЮК

■ Блізкая ўлада

ПАЙШЛІ НА ДРУГІ КРУГ

Падведзены вынікі першага круга работы «прамых ліній» з кіраўніцтвам Гомельскага аблвыканкама. Сем тэлефонных сустрэч старшыні Уладзіміра Дворніка і яго намеснікаў з людзьмі па суботах — 315 афіцыйных зваротаў.
— Мы прааналізавалі ўсе дыялогі, — адзначае начальнік аддзела па зваротах грамадзян і юрыдычных асоб Аляксандр ЛОГВІН. — Кожны шосты зварот вырашаны станоўча.

Насельніцтва актыўна выкарыстоўвае гэтую форму работы ўлады, каб вырашаць свае праблемы. Традыцыйна больш за ўсё звароткаў тычыцца жыллёва-камунальнай гаспадаркі: добраўпарадкавання дваровых тэрыторый, рамонту жылля, развіцця водазабеспячэння, газіфікацыі... Людзей хвалююць пытанні сацыяльнай сферы: прызначэнне пенсій і дапамог, медыцына, адукацыя, транспарт, гандаль. Адно з самых балючых пытанняў — дарогі. Іх рамонт і ўтрыманне патрабуе мільярдных затрат, таму аднамомантна немагчыма ўсё зрабіць. Графікі рамонту дарог ёсць у кожным райцэнтры. Пры гэтым сацыяльны стандарт — 70% асфальтаванага пакрыцця ў райцэнтрах — выконваецца. Мясцовыя ўлады знаходзяць магчымасць для грэйдзіравання многіх вуліц, правядзення ямачнага рамонту.

Самыя спрэчныя пытанні, як звычайна, тычацца землекарыстання. І ўсё ж асноўная частка, прыкладна 65-70% — гэта кансультацыі, якія грамадзяне хочуць пачуць менавіта ад першых асоб Гомельшчыны. Напрыклад, як скарыстацца льготным крэдытам, ці правільна налічаны кошт прыватызацыі і г.д. Людзі атрымліваюць тлумачэнні не толькі падчас самога тэлефанавання, але і пасля — на працягу 15 дзён у пісьмовым выглядзе. Аляксандр Логвін адзначае: праблемы, якія нельга вырашыць імгненна па аб'ектыўных прычынах (іх каля 20%), узяты на далейшы кантроль.

— Як паказвае практыка, у далейшым вялікая колькасць гэтых кантрольных зваротаў вырашаецца станоўча. Разам з тым станоўча вырашаныя пытанні адносяцца ў большасці да кампетэнцыі мясцовых органаў улады. Я раіў бы жыхарам нашай вобласці часцей звяртацца на тыя тэлефонныя лініі, якія праводзяцца ў райвыканкамах. Тым больш, мы туды накіроўваем звароты, якія адносяцца да іх кампетэнцыі. Мясцовай уладзе трэба падымаць свой аўтарытэт менавіта вырашэннем праблем людзей.

Між тым, адзначае Аляксандр Мікалаевіч, палова прынятых тэлефанаванняў — ад жыхароў абласнога цэнтра. Самай незвычайнай ён лічыць прапанову аб арганізацыі ласінай фермы на Палессі.

Па просьбе жыхароў вёскі Бялёў Жыткавіцкага раёна Мархараўскім сельсаветам вызначана месца, дзе з вясны будзе пасвіцца свойская жывёла.

Зрабіць асвятленне вуліц прасілі жыхары Навабеліцкага раёна Гомеля, а таксама райцэнтраў Ветка, Лоеў і вёскі Уза Гомельскага раёна, што і было выканана ў кароткі тэрмін.

Ветэрану Вялікай Айчыннай вайны Івану Філімонавічу Сулкоўскаму з Жыткавіч сацыяльнай службай аказана матэрыяльная дапамога ў памеры Br2 млн, і да таго ж устаноўлены дамафон у яго кватэры.

Зроблены дадатковы пункт прыпынку грамадскага транспарту ў Клёнкаўскім мікрараёне Гомеля, што стала вельмі зручна для людзей.

Пасля звароташ на прамыя тэлефонныя лініі было працаўладкавана некалькі грамадзян Украіны.

Аляксандр Логвін адзначае, што тыя абгрунтаваныя паўторныя звароты, якія на першапачатковым этапе не былі разгледжаны належным чынам, аўтаматычна прыводзяць да прыцягнення да адказнасці тых, ад каго залежала іх вырашэнне:

— Мы летась прыцягнулі да адказнасці 236 дзяржслужачых, у мінулым месяцы — пяць старшынь райвыканкамаў пакараны. Гэта прыносіць плён, бо праз кароткі час там наладжваецца работа са зваротамі грамадзян.

Ірына АСТАШКЕВІЧ

НАВІНЫ ПАДЗЕІ

«ТЫДЗЕНЬ ЛЕСУ» Ў ГОНАР ПЕРАМОГІ

З 28 сакавіка па 4 красавіка па ініцыятыве Міністэрства лясной гаспадаркі ў краіне пройдзе акцыя «Тыдзень лесу-2015».

Лесаводы вырашылі прысвяціць яе 70-годдзю Перамогі. Удзельнікі акцыі будуць высаджваць дрэвы ў гонар воінаў-вызваліцеляў. Па традыцыі прыняць удзел у ёй змогуць усе ахвотныя. У лясгасах будуць падрыхтаваны спецыяльныя аб'екты (іх рыхтуецца каля 2 тысяч ва ўсіх рэгіёнах краіны), на якіх добраахвотнікам дадуць магчымасць пасадзіць дрэвы, добраўпарадкаваць тэрыторыю, стварыць памятную алею ці закласці дэндрапарк, паведамілі ў прэс-службе міністэрства. Арганізацыі лясной гаспадаркі забяспечаць усіх удзельнікаў пасадачным матэрыялам і прыладамі працы.

Летась «Тыдзень лесу» сабраў больш за 50 тысяч удзельнікаў. З дапамогай добраахвотнікаў было пасаджана больш за 70 мільёнаў дрэў, прыведзены ў парадак пасля зімы 32 мемарыяльныя комплексы і 55 месцаў партызанскіх стаянак, размешчаных на тэрыторыі ляснога фонду. Падчас акцыі добраўпарадкавана і адрамантавана каля 200 месцаў адпачынку ў лясах, ліквідавана больш за 300 несанкцыянаваных звалак смецця ў лясным фондзе.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЯШЧЭ АДНА АХВЯРА ВЕСНАВЫХ ПАЖАРАЎ

У гарадскім пасёлку Антопаль Драгічынскага раёна загінуў 71-гадовы пенсіянер. У поўдзень суседзі бачылі, як ён распальваў смецце і сухую траву на сваім падворку. А калі ўвечары яны вярнуліся з работы, то ўбачылі каля плота цела суседа, якое месцамі абгарэла.

Праверку па факце яго смерці вядзе аддзел Следчага камітэта Драгічынскага раёна. Вядома, што мужчына жыў адзін, дрэнна хадзіў з-за хваробы ног.

Да жыхароў вобласці праз радыё і тэлебачанне нядаўна звярнуўся начальнік Брэсцкага абласнога ўпраўлення МНС Канстанцін ШАРШУНОВІЧ з заклікам не дапускаць фактаў выпальвання сухой травы. Як бачым, некаторыя грамадзяне не жадаюць чуць папярэджанняў.

Яна СВЕТАВА.

БІТВА ЛІДАРАЎ

Набліжаецца развязка VIII рэспубліканскіх спаборніцтваў па хакеі сярод аматарскіх камандаў на прызы Прэзідэнцкага спартыўнага клуба. Ужо заўтра адбудзецца паядынак паміж лідарамі турніру — камандай Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і камандай Мінскай вобласці. Каманда Прэзідэнта выйграла ўсе пяць папярэдніх сустрэч; на рахунку зборнай Мінскай вобласці — тры перамогі і дзве нічыі. У турнірнай табліцы каманда Прэзідэнта апярэджвае сваіх галоўных апанентаў на два вачкі. Гэты матч пройдзе ў Лядовым палацы Маладзечна.

У гэты ж дзень адбудуцца і іншыя матчы: у Гродне сустрэнуцца каманды Магілёўскай і Гродзенскай абласцей, а гамяльчане на сваёй пляцоўцы прымуць зборную Брэсцкай вобласці. Не прапусціце развязку турніру!

ФАКТЫ

ПЕРАМОЖНЫ ПАЛЁТ «БЕРКУТА»

Каманда Фрунзенскага раёна Мінска стала пераможцай рэспубліканскіх спаборніцтваў «Залатая шайба»

У фінале дывізіёна А, дзе спаборнічалі хакеісты ў малодшай узроставай групе (хлопчыкі 2002-2003 гадоў нараджэння), выступалі каманды раёнаў і гарадоў, у якіх няма крытых пляцовак са штучным лёдам. За першае месца ў гэтым дывізіёне змагаліся гаспадары турніру — каманда «Міраж» з Горак і мінскі «Беркут». Лёс гэтага паядынку вырашыла пасляматчавая серыя булітаў. Дарэчы, перайграўшы «Міраж», «беркуты» ўзялі рэванш за леташняе паражэнне. Акрамя гэтага, форварда мінчан Івана Гарошку прызналі лепшым нападаючым турніру. Трэцяе месца ў дывізіёне А заняла каманда з Гродна — «Прынёманскія ястрабы».

Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.

■ Погляд

ЕЎРАПЕЙСКАЯ БЯСПЕКА: ЦІ ЁСЦЬ МЕХАНІЗМ?

10 сакавіка Расія афіцыйна абвясціла аб прыпыненні свайго ўдзелу ў Сумеснай кансультатыўнай групе (СКГ) па Дагаворы аб звычайных узброеных сілах у Еўропе (ДЗУСЕ). Каб зразумець значэнне гэтага кроку, трэба звярнуцца да гісторыі пытання.

Дагавор быў падпісаны ў лістападзе 1990 года ў Парыжы. Галоўнай яго мэтай было ўсталяванне балансу сіл дзвюх самых магутных груповак у Еўропе — НАТА і Арганізацыі Варшаўскага дагавора, які не дазволіў бы ніводнаму з бакоў мець сур'ёзную перавагу над іншым, гэтым гарантуючы мір у Еўропе. Па асноўных відах узбраенняў — танкаў, баявых браніраваных машынах, самалётах, артылерыі і ўдарных самалётах былі ўстаноўлены абмежаванні. Уся ваенная тэхніка, якая знаходзілася ў распараджэнні двух блокаў звыш устаноўленых лімітаў, падлягала ліквідацыі на працягу сарака месяцаў. На момант дасягнення пагаднення дагавор разглядаўся многімі як сапраўды эфектыўная мера па прадухіленні сутыкнення груповак паміж сабой. Але ўжо ў 1991 годзе Арганізацыя Варшаўскага дагавора спыніла сваё існаванне, а праз некалькі гадоў усе былыя ўдзельнікі АВД, акрамя СССР і ГДР, якія перасталі існаваць, пачалі падрыхтоўку да ўступлення ў НАТА і пасля сталі членамі гэтага блока. У НАТА ўступілі і тры былыя рэспублікі СССР — Літва, Латвія і Эстонія. Сфарміравалася новая сістэма дзвюх самых магутных груповак у Еўропе, адной з якіх стаў рэзка ўзмацнелы НАТА, а другой — Расійская Федэрацыя са сваімі саюзнікамі, у тым ліку і Беларуссю.

Такое змяненне балансу сіл у Еўропе выклікала спробу змяніць ДЗУСЕ, каб дагавор у большай ступені адпавядаў новым рэаліям. Таму на саміце АБСЕ ў Стамбуле 19 лістапада 1999 года было падпісана Пагадненне аб адаптацыі, у рамках якога абавязацельствы бакоў па лімітах узбраенняў былі ўдакладнены. А каб адысці ад блакавага супрацьстаяння, было вырашана распісаць абавязацельствы па відах узбраенняў асобна для кожнай еўрапейскай краіны, што ўдзельнічае ў ДЗУСЕ.

Нягледзячы на тое, што абавязацельствы па новым Пагадненні ў працэсе перамоваў былі ўзгоднены ўсімі краінамі-ўдзельніцамі, далей стала адбывацца нешта, на першы погляд, незвычайнае. У той час як Беларусь, Казахстан і Расія ратыфікавалі дасягнутае Пагадненне, краіны-ўдзельніцы НАТА сталі сабатаваць вынікі дамоўленасцяў. Іх незвычайныя паводзіны цалкам вытлумачальныя — адчуваючы ваенную перавагу ў новай сітуацыі на сваім баку, НАТА не жадае звязваць сябе ніякімі дамовамі па звычайных узбраеннях у Еўропе. А гэта наводзіць на сумныя разважанні пра тое, што мір у Еўропе больш крохкі, чым хацелася б.

І Расія, і Беларусь неаднаразова выказвалі сваю заклапочанасць сітуацыяй, якая склалася. На жаль, шматлікія спробы падштурхнуць краіны-ўдзельніцы НАТА да ратыфікацыі пагаднення да поспеху не прывялі. Не спрыяе гэтаму і тое, што шэраг новых краін-членаў НАТА наогул адмовіўся далучацца да дагавора і ўсталёўваць для сваіх армій якія-небудзь абмежаванні. Пры гэтым фармальнай адгаворкай для краін НАТА пра нежаданне ратыфікацыі новай версіі дакумента аб звычайных узбраеннях служыць прысутнасць расійскіх узброеных сіл на тэрыторыях Прыднястроўя, Паўднёвай Асеціі і Абхазіі.

У ліпені 2007 года Расія абвясціла аб прыпыненні ўдзелу ў ДЗУСЕ. З гэтай прычыны ў дачыненні да яе сталі немагчымыя інспекцыйныя паездкі па выкананні ўмоў дамовы, якія да гэтага рэгулярна праводзіліся.

На фоне падзей 2014 года на ўкраінскай тэрыторыі Расія прыступіла да далейшых крокаў па адмове ад удзелу ў ДЗУСЕ. Напрыканцы мінулага года міністр замежных спраў Расіі Сяргей Лаўроў заявіў пра смерць гэтага дагавора. Таму рашэнне 10 сакавіка 2014 года аб прыпыненні расійскага ўдзелу ў Сумеснай кансультатыўнай групе па ДЗУСЕ не выглядае нечаканым. Пры гэтым Расія звярнулася да Рэспублікі Беларусь з просьбай у далейшым прадстаўляць яе інтарэсы ў СКГ. Згода беларускага боку была атрымана.

Нягледзячы на тое, што абавязацельствы па новым Пагадненні ў працэсе перамоваў былі ўзгоднены ўсімі краінамі-ўдзельніцамі, далей стала адбывацца нешта, на першы погляд, незвычайнае. У той час як Беларусь, Казахстан і Расія ратыфікавалі дасягнутае Пагадненне, краіны-ўдзельніцы НАТА сталі сабатаваць вынікі дамоўленасцяў.

Што тычыцца рэакцыі краін НАТА на дзеянні Расіі, то яна была агучана генеральным сакратаром НАТА Енсам Сталтэнбергам ужо на наступны дзень падчас прэс-канферэнцыі ў Бруселі: «Мы расчараваныя рашэннем Расіі прыпыніць удзел у рабоце групы. Кансультацыі па пытаннях скарачэння ўзбраенняў важныя».

На самай справе важная, вядома ж, негатоўнасць кансультавацца па пытаннях скарачэння ўзбраенняў, а імкненне стварыць надзейны механізм па бяспецы ў Еўропе, які будзе выконвацца ўсімі краінамі-ўдзельніцамі. На жаль, ДЗУСЕ такім механізмам быць відавочна перастаў. І нічога не сведчыць пра тое, што ў бліжэйшыя гады будзе створаны новы эфектыўны механізм. У прыватнасці, заклікі Расіі весці далейшы дыялог аб кантролі над звычайнымі ўзбраеннямі ў Еўропе ў новым фармаце па зразумелых на фоне ўкраінскага крызісу прычынах у краін-членаў НАТА ніякага энтузіязму не выклікалі.

Сяргей КІЗІМА,
доктар палітычных навук.

■ Настраёвае

Дарогу вясне!

Жыў-быў бацька Год. І было ў яго аж чатыры дачкі: Зіма, Вясна, Лета і Восень. Жылі яны дружна, але ж такога не было, каб усе збіраліся разам. На зямлю, прынамсі, прыходзілі па чарзе, гаспадарылі ў адведзены Годам час...

Але ж аднойчы, калі Зіма яшчэ не скончыла свайго царавання, яе малодшай сястрыцы Вясне ўздумалася пагарэзіць. Спусцілася яна з нябёсаў і са жменяй цёплых сонечных промняў прабегла па зямлі: хоць месцамі, але ж растапіла снягі, абудзіла да жыцця прыроду...

Зіме гэты жарт, вядома ж, не спадабаўся, яна вырашыла адпомсціць, для чаго, калі скончыўся час яе панавання, нікуды з зямлі не пайшла: як ні прасіў яе бацька Год, яшчэ мацней скоўвала рэкі лёдам, яшчэ настойлівей круціла завірухамі.

Ох, і цяжка ж тады прыйшлося ўсяму жывому! Вярнуўшыся з выраю, гінулі пералётныя птушкі, не хапала кармоў хатняй жывёле, у скляпах прарастала бульба...

І тады ўсе людзі сталі выходзіць з хат і ў чаканні цяпла раскладваць вялікія вогнішчы. Горача і няўтульна стала ад іх Зіме, і яна ўрэшце здалася: хуценька збегла дадому...

А ў людзей з таго часу з'явілася традыцыя напрыканцы апошняга зімовага месяца святкаваць Масленіцу: нагадваць спадарыні Зіме, што час яе ўжо мінуў — пара саступаць дарогу...

Наталля ДРОБЫШАВА,
г. Касцюковічы

■ Пасля публікацыі

УЧАСТАК БУДЗЕ ЗАМЕНЕНЫ

Працяг гісторыі будаўніцтва гандлёвага цэнтра ў сталічным мікрараёне «Сухарава»

Месяц таму ў «Звяздзе» быў надрукаваны артыкул пра спрэчную будоўлю ў Мінску. На вуліцы Шаранговіча пачалі ўзводзіць 5-павярховы будынак будучага гандлёвага цэнтра. Жыхары найбліжэйшых да ўчастка дамоў і прыхаджане храма ў гонар Архангела Міхаіла, што знаходзіцца зусім недалёка ад будоўлі, шчыра занепакоіліся бяспекай такога праекта. Асабліва калі будаўнікі вырылі катлаван глыбінёй 7 метраў ледзь не пад вокнамі аднаго з дамоў.

Людзі даслалі афіцыйныя звароты ў Мінгарвыканкам, Генеральную пракуратуру і Адміністрацыю Прэзідэнта. Улады пачулі заклапочаных грамадзян і арганізавалі сустрэчу ўсіх бакоў, на якой вусна папрасілі забудоўшчыка часова прыпыніць работы на ўчастку.

Падчас высвятлення правамернасці будаўніцтва «Звязда» таксама накіравала зварот у Мінгарвыканкам, у якім папрасіла пракаментаваць сітуацыю...

У атрыманым афіцыйным адказе адміністрацыі Фрунзенскага раёна Мінска паведамляецца, што будаўніцтва спынена, а Мінгарвыканкамам прынята рашэнне «аб разглядзе магчымасці выдзялення ТАА «НГМакась» кампенсацыйнага зямельнага надзелу». Можна дапусціць, што будоўля на вуліцы Шаранговіча не толькі спынілася, але ўжо і не працягнецца.

Такі ж самы адказ атрымаў і Аляксандр Несцярчук, прыхаджанін храма ў гонар Архангела Міхаіла, ад імя якога дасылаўся адзін са зваротаў. У лісце паведамляецца, што будоўля спынена і ўчастак будзе заменены. Іншыя члены праваслаўнай абшчыны таксама пацвердзілі, што работ на ўчастку ўжо даўно няма. Яны выказалі падзяку ўладзе за тое, што ў гэтай далікатнай справе яна не засталася абыякавай да праблем людзей.

Вераніка ПУСТАВІТ

ДЛЯ ЗВАРОТАЎ ZVAROT@ZVYAZDA.MINSK.BY ДЛЯ ЗВАРОТАЎ ZVAROT@ZVYAZDA.MINSK.BY

«АЛЕСЯ» НА ЗАВЫШАНСКІМ ВОЗЕРЫ

Санаторый «Алеся» ўтульна размясціўся на самым паўднёвым возеры Берасцейскага Палесся, сярод прасторы казачна-непаўторнай лясной прыгажосці. Сюды прыязджаюць тыя, хто хоча атрымаць асалоду ад цішыні, спакою і фарбаў беларускай прыроды. Але галоўнае, што «Алеся» — гэта сучасная здраўніца, у ёй створаны ўсе ўмовы для адпачынку і лячэння. Палеская здраўніца прываблівае адпачывальнікаў з Расіі, Украіны і нават Польшчы.

У «Алесі» працуюць больш за сорак медсясцёр і санітарак, прычым працуюць па шмат гадоў. Напрыклад, Ніна Гацэвіч, Людміла Ткачук тут ужо амаль 30 гадоў, лічы, з часу адкрыцця ўстановы.

Вольга Самуйлава з пяцігадовымі сынамі-двайнятамі Святаславам і Цімафеем прыязджала ў «Алесю» з Магілёва. Маме і дзеткам асабліва даспадобы прыйшліся водныя працэдуры. У санаторыі ёсць таксама лячэбныя фізкультура, масаж, фіта- і ароматэрапія, саўна і цеплалячэнне, гразевыя аплікацыі, бальнеалячэнне і гідратэрапія, электрасвятлолячэнне, лазератэрапія.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА, *Іванаўскі раён.*

МЕДЫЦЫНА ЗАЎТРАШНЯГА ДНЯ

РАННІ РАК

Летась падчас прафілактычных аглядаў медыкі выявілі на 20 працэнтаў больш выпадкаў злаякасных новаўтварэнняў, чым у папярэднім годзе.

У 60 працэнтах выпадкаў анкалагічныя захворванні выяўляюцца на ранніх стадыях.

Колькасць пацыентаў са злаякаснымі новаўтварэннямі, якія пражылі звыш 5 гадоў, выросла амаль на 20 працэнтаў (у параўнанні з 2013 годам).

Чэргі на аператыўныя ўмяшанні з прычыны новаўтварэнняў адсутнічаюць.

Сёлета будзе ўведзена найбуйнейшая на постсавецкай прасторы малекулярна-генетычная лабараторыя для ранняй анкалагічнай дыягностыкі. З'явіцца магчымасць абследавання на пазітронна-эмісійным тамографе.

Працягваюцца пілотныя скрынінгавыя праграмы па дыягностыцы раку прастаты, малочнай залозы, каларэктальнага раку і раку шыйкі маткі.

У параўнанні з 2000 годам анкалагічная захваральнасць павялічылася летась амаль на 40 працэнтаў. Паказчык смяротнасці ад злаякасных новаўтварэнняў крыху знізіўся.

ПЕРАСАДКА ЛЁГКАГА

Па колькасці эндапратэзавання буйных суставаў на 1 млн жыхароў мы выйшлі на першыя пазіцыі сярод краін СНД. Летась выканана звыш 6,4 тысячы такіх аперацый.

Першае месца ў СНД у нас і па колькасці трансплантацый на 1 млн жыхароў. Іх праведзена 412 (285 — ныркі, 45 — сэрца, 77 — печані, 7 — падстраўнікавай залозы і 1 — лёгкага). Дзве трансплантацыі зроблены дзецям.

Цягам года 16,5 тысячы чалавек здалі кроў на бязвыплатнай аснове.

ДАЎЖЭЙ ЖЫЦЬ

Чаканая працягласць жыцця беларусаў — 72,6 года (латышоў — 74, чэхаў — 78, немцаў — 81).

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

...І РЭЦЭПТЫ — БЕЗ БЛАНКАЎ

Урач агульнай практыкі. У большасці сельскіх амбулаторый сёння працуюць менавіта такія спецыялісты. З'явяцца яны пасля адпаведнай падрыхтоўкі ўчастковых тэрапеўтаў і ў гарадах.

Скаргі. Аналіз зваротаў паказвае, што з 20-30 званкоў на гарачую лінію міністэрства хіба толькі адзін патрабуе ўмяшання, без якога цяжка было б разабрацца на месцы.

Крокавая даступнасць. У жылых новабудоўлях сталіцы пачалі вымяркоўваць кватэры пад урачэбныя кабінеты, якія з'яўляюцца філіяламі паліклінік.

Інфарматызацыя. Сёлета ў паліклініках Мінска павінна ўкараніцца практыка выдачы электронных рэцэптаў (па краіне — крыху пазней). У ідэале гэта азначае, што на рукі не будуць выдавацца ніякія бланкі. Уся інфармацыя будзе даступная аптэчнай сетцы. Электронныя карткі плануецца ўвесці цягам наступнага года.

Асноўная прычына захваральнасці, непрацаздольнасці і заўчаснай смерці — неінфекцыйныя захворванні. У структуры прычын агульнай смяротнасці пераважаюць хваробы органаў кровазвароту, анкалагічныя захворванні і знешнія прычыны (траўмы, атручэнні і інш.).

Для паляпшэння сітуацыі цяпер узгадняецца з усімі зацікаўленымі бакамі распрацаваны Міністэрствам аховы здароўя **праект Дзяржаўнай праграмы прафілактыкі, барацьбы і кантролю неінфекцыйных захворванняў у Рэспубліцы Беларусь на 2016—2020 гады. Ён прадугледжвае новы падыход з удзелам усіх міністэрстваў і ведамстваў.**

АЙЧЫННЫЯ ЛЕКІ

Прамысловую вытворчасць лекавых сродкаў забяспечваюць 28 айчынных прадпрыемстваў, з якіх 12 маюць сертыфікаты GMP на экспартна арыентаваныя вытворчыя ўчасткі. Новы фармзавод з'явіцца ў Бешанковічах (Віцебская вобласць) і новы цэх у Лідзе (Гродзенская вобласць).

— Мы развіваем фармацэўтычную прамысловасць, укладваем вялікія крэдытныя, дзяржаўныя грошы, — адзначыў Васіль Жарко. — Выпускаем сёння звыш 1300 найменняў. Штогод асвойваем больш за 400 новых лекаў. Такім чынам замяняем імпарт. У названай галіне рэалізуецца некалькі праектаў, і мы будзем развіваць гэты кірунак.

«Звязда»: ***На жаль, клапаціцца пра пажылых бацькоў адмаўляюцца не толькі выпівохі, але і, здавалася б, нармальныя сем'і — добра адукаваныя, забяспечаныя. Ці не спарадзіла такую сітуацыю сацыяльная нераўнасць нашай дзяржавы? Бо хапае людзей, якія лічаць, што ім павінны, і чакаюць, каб іх забяспечылі за кошт бюджэту і вырашылі ўсе праблемы.***

Аляксандр БАРАДАЎКА:

— Утрыманства сёння — гэта біч. Адрасная дапамогай і іншымі льготамі карыстаюцца не толькі тыя, хто рэальна мае ў іх патрэбу. Некаторыя за кошт дзяржавы спрабуюць паразітаваць. У Барысаве на сацыяльным абслугоўванні стаіць 1864 чалавекі, з іх у 376 пажылых грамадзян дзеці жывуць у тым жа населеным пункце ці ў адным доме. Часта сацыяльныя работнікі сутыкаюцца з тым, што пенсіянеры патрабуюць падмесці падлогу, памыць вокны, хоць іх дзеці знаходзяцца ў суседнім пакоі. Старыя кажуць: «А вы іх не чапайце, у іх шмат працы, стамілія». Неадзінокія пажылыя бацькі звяртаюцца ў наша ўпраўленне і скардзяцца, што ім не хапае грошай на адзенне, ежу, лекі. Летась мы адмовілі 171 чалавеку ў аднаразовай матэрыяльнай дапамозе, паколькі іх працаздольныя дзеці атрымлівалі добрую заработную плату і жылі побач.

Алег КАРАЗЕЙ:

— Артыкулам 175 Крымінальнага кодэкса вызначана адказнасць за ўхіленне паўналетніх працаздольных дзяцей больш як на тры месяцы на працягу года ад выплаты па рашэнні суда сродкаў на ўтрыманне непрацаздольных бацькоў, якім неабходна матэрыяльная дапамога. На практыцы гэты артыкул выкарыстоўваецца вельмі рэдка. Сёлета зарэгістравана толькі два факты такога злачынства, а ў папярэднія тры гады не было ніводнага.

«Звязда»: ***Справа, напэўна, у тым, што большасць бацькоў, нават у крытычнай сітуацыі, не стануць судзіцца са сваім безадказным «дзіцем». На такі крок псіхалагічна складана адважыцца. Але ж бываюць выпадкі, калі дарослыя дзеці не толькі не дапамагаюць, у тым ліку і матэрыяльна, старым, але і вымагаюць у пенсіянераў грошы, здзекуюцца з пажылых сваякоў, збіваюць іх.***

Алег КАРАЗЕЙ:

— Толькі ў мінулым годзе больш за 8 тысяч пажылых грамадзян пацярпелі ад злачынстваў. Большасць гэтых крымінальных дзеянняў складаюць крадзяжы. Зарэгістравана таксама 240 хуліганстваў, 80 выпадкаў прычынення цяжкіх цялесных пашкоджанняў, 70 забойстваў. Часам гэтыя правапарушэнні ўчыняюцца і дзецьмі. У асноўным па матэрыяльных прычынах. Дарослыя дзеці, якія не працуюць, жывуць за кошт сваіх бацькоў і або настойлівасцю, або пагрозамі і сілай вымагаюць грошы ў старых. Сёлета 131 злачынства адбылося менавіта ў сям'і. Кожнае дзясятае забойства (ці кожнае трэцяе бытавое забойства), зарэгістраванае ў нашай краіне, — з боку дарослага дзіця ў дачыненні да пажылых бацькі ці маці. Гэта вялікая лічба.

Органы ўнутраных спраў працуюць над тым, каб прадухіліць хатні гвалт. У 2014-м мы вынеслі 214 абаронных прадпісанняў, 166 з якіх звязаны з рашэннем

«Гады тры таму неадзінокіх пастаяльцаў было ў межах 10 працэнтаў, цяпер амаль у два разы болей — 18 працэнтаў».

выселіць агрэсара з жылога памяшкання. З жніўня 2013-га дзейнічае новы артыкул Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях, які прадугледжвае адказнасць за гвалт у сям'і нават без наяўнасці цялесных пашкоджанняў. Сам факт прычынення пабояў ці фізічных і псіхічных пакут з'яўляецца дастатковай падставай для пакарання свайго-агрэсараў. Увядзенне гэтага захаду значна павялічыла колькасць грамадзян, прыцягнутых да адказнасці за хатні гвалт: з 30 тысяч у 2013 годзе да звыш 40 тысяч у 2014-м.

«Звязда»: ***У дачыненні да ненадзейных бацькоў дзейнічае Дэкрэт №18 «Аб дадатковых мерах па дзяржаўнай абароне дзяцей у сацыяльна неўладкаваных сем'ях». Магчыма, сёння з'явілася патрэба ў падобным дакументе і дзеля абароны старых?***

Святлана ШЫЛАВА:

— З пункту гледжання сухога закону, Канстытуцыя абавязвае дзяцей даглядаць бацькоў. Пажылыя людзі маюць права, калі дарослыя дзеці ад іх адмаўляюцца, спагнаць аліменты на сваё ўтрыманне. Аднак ментальнасць такая, што старыя не толькі не выступяць супраць, але яшчэ будуць да пенсіі цягнуць і дзяцей, і ўнукаў. Тры гады таму да мяне на прыём прыйшла бабуля. Скардзілася, што з яе пенсіяй цяжка аплачваць жыроўку за трохпакаёвую кватэру. Кажу жанчыне: «Прадайце сваё жыллё, купіце двушку і жывіце, як каралева». А бабуля адказвае: «Вы што, у мяне ж унучка ёсць!» Дык няхай бы ўнучка і плаціла за камунальныя паслугі, а не пенсіянерка бегала прасіць у дзяржавы дапамогі. Мы павінны пачаць з маральнага аспекту, вяртаць адказнасць, людскасць у наша спажывецкае грамадства. Пакаранне і заканадаўствам мы нічога не зменім.

Аляксандр БАРАДАЎКА:

— Згодны з вамі. Але колькі яшчэ часу нам спатрэбіцца, каб выхаваць новае пакаленне і пераламіць сітуацыю? 10-15 гадоў? А што рабіць сёння? Я лічу, нам неабходны такі ж дакумент, як Дэкрэт №18, які б уздзейнічаў на безадказных дзяцей. Каб даслоўна, па пунктах было прапісана, што рабіць у кожнай канкрэтнай сітуацыі. Давайце вернемся да пытання гвалту ў сям'і. Ёсць абаронае прадпісанне, паводле якога ў «крызісны» пакой могуць адсяліць не толькі ахвяру, але і агрэсара. Што атрымліваецца? П'яніцу, які збіў сваіх бацькоў, за дзяржаўныя сродкі даюць камфортны пакой для пражывання. Я разумею, калі ізаляваць гэтага чалавека і прымусова накіраваць на грамадскія работы — тады быў бы эфект. А колькі старых гіне на пажарах, толькі таму што іх дзеці не забяспечваюць належны догляд і супрацьпажарныя меры ў старых хатах! Для тых выпадкаў, калі ствараецца пагроза жыццю і здароўю чалавека і іх дзецьмі нічога не робіцца, трэба зрабіць заканадаўства больш жорсткім. Сёння назіральныя камісіі звяртаюцца па месцы працы дзяцей, заклікаюць іх да адказнасці, духоўнасці, але ў выніку нічога не адбываецца.

«Звязда»: ***Як яшчэ можна паўплываць на сітуацыю? І адказнасць дарослых дзяцей павысіць, і пенсіянерам забяспечыць камфортную старасць?***

Аляксандр БАРАДАЎКА:

— Трэба прапаноўваць новыя формы ў сферы сацыяльнага абслугоўвання. Напрыклад, той эксперымент па ўкараненні рэнты, што праводзіцца ў Мінску па 2015 год. Пажылыя людзі, якія не могуць годна сустрэць старасць, перадаюць сваё жыллё дзяржаве ў абмен на догляд. Можа, варта ажыццяўляць гэту форму і ў іншых гарадах? Тады не будзе сітуацый, калі дзеці толькі і чакаюць, калі можна будзе падзяліць кватэру пасля смерці бацькоў.

Святлана ШЫЛАВА:

— Ды не аддадуць нашы пенсіянеры ўласнае жыллё чужым людзям.

Марыя ГАРБАЦЭВІЧ:

— Гэты эксперымент праводзіцца ў сталіцы з 2011 года. Чалавек па дагаворы рэнты перадае жыллё ў камунальную ўласнасць горада, а сам можа застацца ў сваёй кватэры ці пасяліцца ў інтэрнат «Світанак» у вёсцы Траскоўшчына. За чатыры гады заключана 15 дагавораў. Гэта прымусіла родзічаў актывізаваць сямейныя формы догляду, паколькі людзі баяцца страціць жыллё. Па выніках 2015-га будзем уносіць прапанову ў Савет Міністраў аб распаўсюджванні такой формы сацыяльнага абслугоўвання на рэспубліку. Але тут ёсць свае падводныя камяні. У Мінску жыллё дарагое, таму рэнта выгадная і пенсіянеру, якому гарантуюць догляд, і дзяржаве. А калі ў чалавека невялікая хатка ў вёсцы, што амаль нічога не каштуе? Рэнта ж прадугледжвае і выплату пенсіі ў поўным памеры, і дзяржаўнае забеспячэнне.

Святлана ШЫЛАВА:

— Цяпер будзе распрацоўвацца законапраект аб дзяржаўна-прыватным партнёрстве. Хацелася б, каб людзі, якія маюць грошы, не толькі ўкладвалі іх у ігральныя клубы і рэстараны, што даюць хуткі прыбытак, але і развівалі сферу сацыяльнага абслугоўвання. Напрыклад, будавалі прыватныя хоспісы. Гэта патрэбна, каб чалавек мог выбраць лад жыцця ў старасці. У добрыя ўмовы людзі самі пойдуць. Тым больш у хоспісах яны не будуць у адзіноце, а старыя, што перанеслі інсульт, ці анкахворыя атрымаюць належную дапамогу.

«Звязда»: ***Уразумела, што, каб вырашыць праблему з безадказным стаўленнем дзяцей да пажылых бацькоў, трэба перш за ўсё ўздзейнічаць на свядомасць. Як закласці ў сям'і, умоўна кажучы, правільныя адносіны?***

Іван ТАРАШКЕВІЧ:

— Павінна быць сістэма выхавання ў сям'і, павага да іншых. У нас бацькі б'юцца, як рыба аб лёд, каб усё для дзяцей зрабіць. А потым яшчэ і ўнукаў падымаюць. Самі запішуць кватэру на дачку, гаражы на іншых сваякоў, а потым слёзы льюць. У Амерыцы, напрыклад, вы не сустрэнеце такога, каб бацькі ўсё жыццё забяспечвалі дзяцей. Споўнілася 18 гадоў — ідзі працуй, ты ўжо дарослы чалавек. Калі б з дзяцінства людзі былі прывучаны да працы, такіх сітуацый, якія мы сёння з вамі абмяркоўваем, было б менш.

Жанна КОЦІК:

— Трэба выхоўваць і дзяцей, і бацькоў. Бываюць жа і такія, што не займаліся выхаваннем, а цяпер патрабуюць, каб дзеці іх даглядалі.

Святлана ШЫЛАВА:

— Цяпер нават тэндэнцыя назіраецца сярод адзінокіх мам: яны самі стараюцца зарабляць і адмаўляюцца ад аліментаў былога мужа (тым больш калі той алкаголік), каб ён потым не змог спагнаць з дарослага дзіцяці грошы на сваё ўтрыманне.

Аляксандр МАРЧАНКА:

— Значную ролю ў выхаванні адыгрывае культура. Ёсць прыклады, калі нашы сучаснікі, маладыя людзі, пішуць сур'ёзныя драматургічныя творы пра адносіны паміж бацькамі і дзецьмі. Напрыклад, лаўрэат Дзмітрыя Багаслаўскага «Ціхі шоргат сыходзячых крокаў», якая ідзе ў Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі і ў Купалаўскім тэатры. У яго ж творы «Акалі заўтра няма» разглядаюцца адносіны паміж унукам і хворым дзедам, якіх бацькі пакінулі ў замкнёнай прасторы аднапакаёвай кватэры. Зараз у нашым тэатры рыхтуецца спектакль «Дзед» па п'есе Вячаслава Паніна «Я так і зрабіў». Там канфлікт разгортваецца паміж ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, які жыве ў сваёй кватэры, і дзецьмі, што прэтэндуюць на жылплошчу старога.

Як бачыце, у сучасным мастацтве гэты зрэз тэмы сямейных адносін існуе. Але ёсць адзін момант. Зала РТБД змяшчае 200 чалавек. Калі спектакль ідзе ў рэпертуары тэатра адзін раз на месяц (сезон — 9 месяцаў), то пры ўмове, што ў нас аншлаг, пастаноўку можа паглядзець дзве тысячы чалавек. Напэўна, гэта не тая моц інфармацыйная, якая можа паўплываць на ўсіх грамадзян краіны. Але я рады, што падобныя тэксты і спектаклі ёсць і даюць магчымасць школьнікам, студэнтам і больш сталым людзям задумацца над такім сур'ёзным пытаннем.

«Звязда»: ***Што сёння значыць — клапаціцца пра бацькоў?***

Святлана ШЫЛАВА:

— Пажылому чалавеку патрэбна ўвага, у першую чаргу. Клопат і цеплыня — вось чаго чакаюць нашы старыя. Хаця б патэлефанаваць раз на дзень, заехаць да іх у выхадныя. А тых, хто не хоча даглядаць бацькоў, адпраўляць на грамадскія работы. Гэта псіхалагічна падзейнічае: як бы ні было, людзі баяцца ганьбы.

Аляксандр МАРЧАНКА:

— Любоў — гэта галоўнае. У мяне самога ўжо старыя бацькі: 75 гадоў бацьку, маці 70 будзе. Не ўяўляю, як можна абысціся не па-чалавечы з роднымі людзьмі, якія і да гэтага часу клапоцяцца пра мяне. Эмацыйныя адносіны ў сям'і стаяць на першым месцы.

«Круглы стол» праводзіла Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ. Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

Марыя ГАРБАЦЭВІЧ

Жанна КОЦІК


Іван ТАРАШКЕВІЧ

Святлана ШЫЛАВА

Аляксандр БАРАДАЎКА

Алег КАРАЗЕЙ

Аляксандр МАРЧАНКА

■ Нашчадкі вогненных вёсак

ПОМНІК ЛЯ ДАРОГІ

Жыхарка спаленай вёскі Ахоцічы клапоціцца пра тое, каб ніхто з яе землякоў, загінулых падчас вайны, не быў забыты

Валянціна РУСАКЕВІЧ каля помніка разам з сынам Іванам і пляменніцай Нінай

З моманту трагічных падзей прайшло больш за 70 гадоў, але Валянціна Русакевіч добра памятае прозвішчы амаль усіх сваіх аднавяскоўцаў, забітых немцамі. На помніку, які паставілі на ўскрайку вёскі за сродкі яе родных, 118 імён. Прычым болей за 20 з іх маюць непасрэднае дачыненне да сям'і гэтай жанчыны. І па кожным сэрца дагэтуль баліць.

КАМІНСКІХ РАССТРЭЛЬВАЛІ НА МЕСЦЫ

Русакевіч яна стала пасля вайны, а тады, у 1941-м, 8-гадовая Валечка насіла распаўсюджанае ў гэтых мясцінах прозвішча Камінская. У Ахоцічах і навакольных вёсках было шмат яе радні. У доме па суседстве, двор у двор, жыў дзед Віна (Вікенцій) разам з сям'ёй сына Сяргея. Яны, па сутнасці, і сталі першымі ахвярамі ў тым чорным спісе.

Вайна адразу падзяліла жыхароў вёскі на сваіх і чужых. Тыя, чужыя, данеслі немцам, што Сяргей раней вазіў чырвонага камандзіра і ў яго ёсць нейкая там «рацыя». Немцы прыйшлі да яго дамоў і забілі ўсіх — Сяргея, зусім яшчэ юную яго жонку Вольгу (да вайны яна скончыла 7 класаў), яе маці, якая прыбегла ратаваць дачушку, нават дзеда Віну. Старога катавалі так, што ў яго не засталося ніводнай цэлай костачкі, рукі і ногі трымаліся на адной скуры. Яго крыкі, ад якіх у жылах стыла кроў, чула, здавалася, уся вёска. А параненую Вольгу, якая павінна была неўзабаве нарадзіць, нелюдзі закідалі коўдрамі і падушкамі пасярод хаты і падпалілі.

З прыходам немцаў смерць надоўга прапісалася ў Ахоцічах. Пасля гвалту ў доме Камінскіх трое сыноў дзеда Віны пайшлі ў партызаны. І гэтае прозвішча стала фатальным для многіх іх родных. Цяжарную жонку старэйшага, Уладзіміра, немцы адразу ж расстралялі, а дваіх яго зусім яшчэ малых дзяцей завезлі ў Бабруйск. Адтуль яны больш не вярнуліся. Як і Віктар, бацька Валянціны Русакевіч. А ў 1943-м расстралялі і яе брата, непаўналетняга Мікалая.

— Гэта адбылося падчас адной з карных аперацый, — у старой жанчыны па твары цякуць слёзы, і яна нават не хавае іх. — У той дзень завязаўся бой паміж партызанамі і паліцаямі, хутка прыехалі немцы, пачалі шукаць сярод жыхароў родных партызанаў. Я з маці і малодшымі братамі хавалася ў лесе. А Мікалай быў на прымусовых работах. Калі ў вёсцы пачаўся шум, ён прыбег да хаты. Так яго і схапілі.

Дванаццаць чалавек, сярод якіх з дзяцей быў толькі Міколка, вывелі за вёску і паставілі каля прыгатаванай для іх ямы. Хлопчык, каб схавацца ад чорных дулаў аўтаматаў, закрыў твар рукамі. Свінцовая чарга прабіла наскрозь танюсенькія дзіцячыя далоні і схаваныя за імі вочы.

Мясцовым жыхарам пад страхам смерці забаранялася забіраць забітых. І толькі пад покрывам ночы яны змаглі наблізіцца да іх, каб на посцілках зацягнуць спачатку дамоў развітацца — і такім жа чынам даставіць на мясцовыя могілкі.

ПРАСНАКІ З КАВАЛКАМІ ШКЛА

Расстрэлы мірнага насельніцтва перыядычна паўтараліся. Выратаваць сваіх дзяцей ад смерці Любові Камінскай (маці Валянціны Віктараўны) дапамагло толькі тое, што стараста выдаў ёй даведку на дзявоцкае прозвішча Ханяк. Камінскіх расстрэльвалі адразу ж. Але быць на валасок ад смерці ўсё роўна прыходзілася неаднойчы. Пасля таго, як арыштавалі мужа, Камінская з дзецьмі перабралася ў Селішча. Аднойчы зімовым вечарам на вёску наляцелі немцы. Жанчына схапіла малых і пабегла хавацца ў лес. Па іх стралялі, але яны выратаваліся. Усіх, хто застаўся ў вёсцы, спалілі разам з дамамі.

Чуткі, што неўзабаве вернуцца нашы, надавалі сілы жыць. Але чым бліжэй насоўвалася Чырвоная Армія, тым больш лютавалі немцы. Яны руйнавалі і палілі хаты, зганялі моладзь у Германію, расстрэльвалі мірных жыхароў. Схапілі і Любоў Камінскую з дзецьмі.

Разам з іншымі людзьмі іх пагналі кудысьці праз разбураныя вёскі. Родныя Ахоцічы было не пазнаць, ад спаленых хат засталіся адны коміны. Для дзяцей дарога была асабліва цяжкай. Валянціна з брацікам Віктарам вельмі адсталі ад калоны. І тое, што адзін з немцаў цярпліва ішоў разам з імі, а не расстраляў на месцы, таксама можна лічыць цудам. Жахлівае ўражанне выклікалі Выжары. Вёска нагадвала сабой прывід. Хаты стаялі цэлыя, а на вуліцах — ніводнага чалавека. Усіх яе жыхароў немцы сагналі ў канцлагер.

— Мы там пераначавалі, а раніцай на машынах нас павезлі ў Бабруйск, — успамінае Валянціна Віктараўна. — Там, у Чырвонай вежы, мы знаходзіліся каля 3 тыдняў. Кармілі нейкімі праснакамі з шалупіння ад грэчкі і проса, дзе трапляліся вялікія кавалкі шкла. І кожны дзень былі допыты. Маці апранала на мяне пінжак і загадвала падгінаць ногі, каб выглядаць меншай ростам. Баялася, каб мяне, як іншых дзяцей, не вывезлі ў Германію.

Аднойчы іх зноў пагрузілі на машыны і кудысьці павезлі. І нечакана паміж Кіраўскам і вёскай Гута адпусцілі. Любоў Камінская павяла сваіх дзяцей да маці ў Пацаву Слабаду. «Неўзабаве ў вёску прыйшлі чырвонаармейцы, і ў бабулінай хаце стала зусім цесна, — кажа Валянціна Русакевіч. — Сярод салдат, якія пасяліліся ў нас, была прыгожая маладзенькая медсястра. Аднойчы яна разам з байцамі адправілася ў Падрэчча «выбіваць» немцаў. Шмат нашых загінула, у тым ліку і тая дзяўчына. Прывезлі іх, як дровы на машыне, і пахавалі каля клуба.

МАЛЮ БОГА, КАБ ТОЛЬКІ НЕ БЫЛО ВАЙНЫ

На покуці чысценькай утульнай хаты Валянціны Русакевіч шмат абразоў. «Кожны дзень малюся, каб вайна нас абмінула, — кажа яна. — Плачу, калі бачу, што адбываецца ва Украіне. Бо ведаю, што гэта такое».

Акрамя ўспамінаў аб цяжкім, але шчаслівым даваенным дзяцінстве, у яе нічога не засталося. Нават фотакарткі бацькі. Ён паспеў паваяваць на фінскай вайне, і не было большай радасці, калі ён з яе вярнуўся. Маці ўжо і не спадзявалася ўбачыць яго жывым. Нават сына, які нарадзіўся пасля яго адыходу, назвала ў гонар бацькі. Але шчасце было нядоўгім. Чарговая вайна забрала яго назаўсёды. Дзе напаткала яго смерць, блізкія так і не даведаліся. І нават цяпер, калі ёй самой гадоў удвая больш, чым было любаму татачку, Валянціна Віктараўна гатова ахвяраваць многім, каб хоць хвілінку пабачыць яго. «Але ён чамусьці не прыходзіць нават у сне. Вось брата Міколку аднойчы сасніла. Толькі чамусьці не маленькім хлопчыкам, а ўжо дарослым мужчынам, з барадой».

Не менш трагічным быў і лёс мужа Валянціны Русакевіч Яўгена Лукіча. Некалькі гадоў таму ён пайшоў з жыцця. Жанчына паказала кнігу пра партызанаў, дзе ёсць фота яе мужа і яго братоў.

— У свёкра, якога немцы забілі за тое, што ён дапамагаў партызанам, было 4 сыны, усе яны ваявалі ў партызанскім атрадзе Храмовіча, — распавядае яна. — Але пасля таго, як загінуў старэйшы Анісім і быў паранены Максім, 15-гадовага Жэню адправілі на Вялікую зямлю. Маўляў, хай хоць нехта з братоў застанецца жывым. Падлетак пэўны час рабіў на адным з маскоўскіх заводаў патроны для фронту, а потым прыпісаў сабе лішні год і зноў пайшоў ваяваць. Яго накіравалі ў Японію.

Сваіх чатырох дзяцей Валянціна і Яўген Русакевічы выгадавалі неабыякавымі да памяці продкаў. Таму і помнік яны рабілі ўсе разам. Галоўным рэалізатарам ідэі і яе асноўным спонсарам стала Алена Галачалава, сваячка з Мінска.

— Аб гэтым помніку марыла яшчэ мая стрыечная сястра Надзея Камінская, родная цётка Алены, — кажа Валянціна Віктараўна. — Грошы на яго ўсё жыццё збірала.

АБ ЧЫМ МАЎЧАЦЬ ВЯСКОВЫЯ МОГІЛКІ

Гэты помнік, нібы раскрытая кніга, вянчае невялікі самаробны пагорак на ўскрайку вёскі. «Ведалі б вы, колькі сіл прыйшлося пакласці на тое, каб яго ўзвесці, — уздыхае сын Валянціны Віктараўны Іван Русакевіч. — Аднаго толькі жвіру прывезена каля 20 машын. Я доўга думаў, як яго раўнаваць, а аднойчы бачу, прыпыняецца каля нашага дома трактар, і кіроўца ідзе да хаты. Папытаў, дзе мясцовыя могілкі. Я расказаў і напрамілуй Бог прасіў дапамагчы. Дзякуй яму, не адмовіўся.

Дарэчы, помнік — не адзінае месца, над якім шэфствуюць Русакевічы. Шмат забітых падчас вайны ляжыць і на могілках іншых вёсак.

— Мы з сынам і на віленскія ездзім, і на баравіцкія, — уздыхае Валянціна Віктараўна. — Там могілкі больш дагледжаныя. А вось у нас у Ахоцічах іх ніхто не чысціць. Прашу браценіка Максіма, каб абрэзаў кустоўе, і сама прыбіраю. Толькі цяжка мне ўжо, як-ніяк 82 гады.

Разам ідзём на ахоціцкія могілкі. Яны хаваюцца ў лесе; драўляная агароджа, якую ўстанавіў некалькі гадоў таму Кіраўскі райсавет, пакасілася і хутка зусім паваліцца. Шмат магіл безыменных. Больш за ўсё перажывае старая жанчына, што, калі яе не стане, ніхто не даведаецца, хто там пахаваны. Родныя расстраляных яшчэ ведалі іх імёны, але час ідзе, і тыя людзі таксама ўжо пайшлі з жыцця. Добра яшчэ, што старэйшы сын Іван, які жыве ў Бабруйску, дапамагае ў добрай справе. Вось паставіў самаробныя крыжы і збіраецца зрабіць металічныя шыльдачкі, каб пазначыць на іх узгаданыя маці імёны.

— Сваякоў было зашмат, — уздыхае жанчына. — Некаторыя нашы сем'і немцы цалкам знішчылі. Камінскія Лука, Макар, Максім... Амаль усе мае стрыечныя загінулі. Даглядаю і могілкі камуністаў Пятра і Радзівона. Вайна ўсіх нас парадніла. У іх з родных нікога няма, нават памінальную запіску няма каму падаць. Вось я і памінаю. Калі былі Дзяды, узяла свечку, спачатку на могілках памалілася, а потым каля нашага помніка. Мы там яшчэ не ўсіх загінулых перапісалі. Але месца засталося, так што абавязкова ўпішам.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

Кіраўскі раён

Даведка

Падчас акупацыі Кіраўскага раёна фашыстамі было знішчана 47 вёсак, спалена жывымі, расстраляна, павешана, вывезена ў нямецкі тыл і лагеры смерці каля 22 тысяч жыхароў.

У спісе спаленых вёскі Ахоцічы, Выжары, Ала... Але самая страшная трагедыя адбылася 15 чэрвеня 1943 года ў вёсцы Баркі, якую цалкам разам з 1800 яе жыхарамі сцёр з зямлі карны батальён Оскара Дэрлівангера. Пра гэта ўсяму свету паведаміў у сваёй мастацка-публіцыстычнай аповесці «Карнікі» беларускі пісьменнік Алесь Адамовіч. На месцы былых Баркоў сёння знаходзіцца помнік усім спаленым вёскам Магілёўскай вобласці.

Наш культурны асяродак

ЖЫРАНДОЛЯ

Выпуск № 9 (266)

■ Ведай нашых!

БАЛЕТ НА ЭКСПАРТ

Цудоўныя артысты Беларусі станцуюць для французскай публікі

Беларускай культуры ёсць што пастаўляць за мяжу, ёсць чым кранаць. Ёсць з чым гастраляваць. У першую чаргу гэта спектаклі класічныя (таму што танцаваць класіку ў нас умеюць), і сярод іншых першыя і галоўныя ў гэтым — балеты «Лебядзінае возера» і «Прыгажуня, якая спіць» Пятра Чайкоўскага.

Навіна цудоўная для балетнай трупы: з гэтымі спектаклямі частка артыстаў накіруецца ў гастрольны тур па гарадах Францыі і Бельгіі. Але для айчыннай публікі таксама навіна: калі ў каго ёсць жаданне паглядзець некаторыя спектаклі са сваімі любімымі артыстамі, то трэба паспяшацца. Таму што з 20 сакавіка па 4 мая ў гастрольным туры за мяжой будуць знаходзіцца народная артыстка Беларусі Вольга Гайко, заслужаная артыстка Беларусі Марына Вежнавец, лаўрэаты міжнародных конкурсаў Людміла Хітрова, Канстанцін Геронік, Юрый Кавалёў, Аляксандра Чыжык, Ігар Аношка, Такатошы Мачыяма, Вікторыя Трэнькіна. Праўда, трэба ўсё ж заўважыць, што балетныя спектаклі ў афішы тэатра за гэты час ёсць: дзякуй Богу, ёсць у нас каму танцаваць. Прычым у гэты час будуць паказаны спектаклі вясновыя — рамантычныя і натхняльныя: «Жызэль, альбо Вілісы», «Сільфіда», «Эсмеральда», «Балеро», «Стварэнне Сусвету». А «Лебядзінае возера» пакажуць на роднай сцэне за гэты час ажно некалькі разоў.

Але ў тых артыстаў, хто з'язджае, працы за гэтыя дні будзе шмат: за 46 дзён трэба паказаць 38 спектакляў. Пры тым, што тур ахоплівае шмат гарадоў: французскі Брэст, Ліможа, Ліён, Ліль, Нант, Марсель, Ніцу, Арлеан, Страсбург, Тулузу, Грэнобль і іншыя. Напружаны графік, шмат пераездаў. Але ж і Парыж: беларускі балет выступіць у гэтым горадзе на сцэне Палаца кангрэсаў.

Ларыса ЦІМОШЫК

■ Падзея

БЕЛАРУСКІЯ «ПАСЛАННІ» ВІЛЬНЮСУ

У вільнюскай выставачнай зале «Тытанік» з вялікім поспехам ажыццяўляецца праект Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў «Пасланні». Гаворка ідзе пра актуальныя дасягненні творчых школ Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. У аснову пакладзены куратарскія канцэпцыі павільёна Беларусі на 56-й Венецыянскай біенале: «Пісьмы свайго часу» і «Час, які злавілі» (аўтары Кацярына Кенігсберг, Ганна Біжык, Алена Русакевіч, Тарас Кучынскі-Паравы).



Алеся Скарабагатая. **Ноч**

У рамках праекта ў Вільнюсе прадстаўлены графіка і фатаграфіка, інсталяцыі, жывапіс, фатаграфіі, літаграфіі беларускіх мастакоў — удзельнікаў нацыянальных і міжнародных мастацкіх выстаў і пленэраў.

Выстава цікавая і тым, што побач экспануюцца работы вядомых і зусім маладых мастакоў Беларусі. Тут, напрыклад, можна ўбачыць работы рэктара Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Міхаіла Баразны; прафесара, заслужанага дзеяча мастацтваў Рэспублікі Беларусь Уладзіміра Зінкевіча і студэнтаў акадэміі Алеся Багданава, Алены Русакевіч або Тараса Кучынскага-Паравога.

«Ствараецца ўражанне, што за апошняе 20-годдзе мастацтва ў Беларусі расквітнела, стала разнастайным, сучасным, але не страціла і свайго самабытнага нацыянальнага каларыту. Сфарміравалася новае плённае пакаленне беларускіх мастакоў, здольнае самастойна арыентавацца ў сучасным, далёка не адназначным мастацкім свеце. Відаць, што сучаснае мастацтва суседзяў ставіцца ўважліва не толькі да навакольнага асяроддзя, яно даследуе новыя формы выказвання, пранікае ў актуаліі сучаснасці, экзістэнцыі чалавека. Добра, што творчы падыход стаў дамінаваць, гэта дапамагае перамагчы аднастайнасць і інертнасць», — сказаў карэспандэнту «Звязды» вядомы літоўскі мастацтвазнаўца Альбертас Вайдзіла.

Выстава «Пасланні» стала адной з найбуйнейшых прэзентацый сучаснага мастацтва Беларусі ў Літве за апошні час.

Вітаўтас ЖЭЙМАНТАС,
уласны карэспандэнт «Звязды» ў Літве

■ З першых вуснаў

Рыгор СІТНІЦА:

«МОЖА, МЫ — ЗАЛАТЫ ЗАПАС БОГА СА СВАЁЙ ПРОСТАСЦЮ...»

Старшыня Саюза мастакоў — самага вялікага беларускага аб'яднання ў сферы выяўленчага мастацтва — Рыгор Сітніца, вядома ж, у першую чаргу дбае і хварэе за сваю супольнасць. Але разважае і як творца — пра тое, што не ўсё ў катэгорыі «мастацтва» сапраўды ім з'яўляецца, як літаратар — пра жыццё вакол, як беларус — пра беларускую мову.

Фота Наталлі АЛЯКСАНДРАВАЙ.

— Сёння шмат кажуць пра недахоп выставачных пляцовак і складаныя ўмовы для прэзентацыі сучаснай творчасці. Праблема сапраўды стаіць так востра?

— Мы б, безумоўна, хацелі, каб дзяржаўных і прыватных галерэй было больш. Але галоўнае, чаго нам не хапае, — грошай, з імі мы б знайшлі пляцоўкі. Разумееце, шмат выстаў, апроч Палаца мастацтваў і дзвюх нашых галерэй, мы ладзім у Нацыянальным мастацкім і гістарычным музеях, у Музеі сучаснага мастацтва. І кожная патрабуе сур'ёзных выдаткаў, якія практычна не вяртае. Каб стварыць ажыятаж вакол мерапрыемства, патрэбна альбо рэклама (зноў грошы), альбо скандальнае мастацтва, чым мы не займаемся.

— Скандальныя творы ж таксама могуць быць мастацтвам — актуальным, канцэптуальным, так званым акцыянізмам.

— Нельга сказаць, што мы традыцыяналісты, ніхто нікому не навязвае мову выказвання (адзінае, што мы вітаем, — высокі прафесіяналізм). Але, напрыклад, пра выставу радыкальнага майстэрства на Вінзаводзе (Цэнтр сучаснага мастацтва ў Маскве. — **Рэд.**) мне няёмка расказваць не толькі вам, а нават сваім сябрам. Гэта пры тым, што я прызнаю мастацтва на 360 градусаў і гатовы чакаць выдатных вынікаў у розных яго накірунках. Але пакуль мы іх чакаем — можам зруйнаваць гуманітарную прастору, дзе жывапіс ужо не будзе патрэбны.

На тое, каб выставіць добрыя карціны, грошай не хопіць, а на мастацтва, дзе распранаюцца і спраўляюць патрэбу на публіку (ёсць такі папулярны Алег Кулік), — хапае. Асноўныя маральныя імператывы сфармуляваныя ў дзесяці запаведзях, нічога больш універсальнага, што рэгулюе паводзіны чалавека і ўтрымлівае яго ад ператварэння ў быдла, ніхто не прыдумаў. Тое, што часам вырабляецца пад выглядам мастацтва, можа згубіць чалавечае аблічча. Таму я жартуючы кажу: «Запішыце мяне ў рэтраграды». Нягледзячы на тое, што я ўвогуле не прымаю цэнзуру — часам мне яе хочацца.

Неяк жартам я прапанаваў: «А давайце я за паўхвіліны зраблю твор мастацтва». І зрабіў: парваў газеты, паклаў шматкі на прыгожы белы ліст і дадаў назву «Інфармацыйны выбух №1». Не хапае толькі вялікага тэксту. Заўважце, колькі слоў пішацца да сучаснага твора! А якія тлумачэнні мне патрэбны, калі я гляджу на карціны Рубенса? Нават для Пабла Пікаса яны не патрэбныя — там усё зразумела. Нішто лепш не выказала жах і трагедыю, чым нерэалістычная, здавалася б, «Герніка».

— Вы сталі старшынёй Саюза мастакоў амаль паўтара года таму. Магчымасці саюза з тых часоў змяніліся?

— Галоўныя нашыя задачы: творчасць і абарона правоў нашых сябраў. І мы ўсё робім, каб адпавядаць свайму найменню. На нас часта наракаюць, маўляў, Палац мастацтваў ператварыўся ў палац гандлю, але яны не ведаюць, што летась мы правялі ў ім трыццаць дзве выставы. А паколькі мы не бюджэтная арганізацыя, а грамадская — павінны зарабляць самі. Мы маем некалькі прэферэнцый ад дзяржавы, але іх не хапае для таго, каб арганізаваць паўнавартасны выставачны працэс. Таму мы ідзем на ахвяру ў іміджы Палаца мастацтваў і разам з тым стараемся насычаць нават камерцыйныя рэчы. У нас праходзілі выставы моды, лялек, архітэктуры. Вядзем перамовы для таго, каб паказаць калекцыю скульптуры і графікі Сальвадора Далі, плануем мультымедыйную выставу, прысвечаную праявам мадэрну — павінна выклікаць фурор.

— Калі вы вымушаны рабіць акцэнт на камерцыйнай дзейнасці, як вы знаходзіце баланс паміж камерцыяй і мастацтвам?

— Мы робім акцэнт на творчую дзейнасць, у нашых мастацкіх праектах камерцыйны складнік не прысутнічае. А гандаль — неабходнасць дзеля выжывання. Нашыя мастацкія камбінаты выконваюць заказы: мы працавалі над афармленнем Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Палаца Незалежнасці, таксама з Оперным тэатрам, Мірскім і Нясвіжскім замкамі, Нацыянальнай бібліятэкай. Мы ствараем помнікі, нашыя мастакі працуюць над тэатральнымі пастаноўкамі, у кіно, выдаюць кнігі — шырокі дыяпазон дзейнасці. Мастак жа павінен нечым зарабляць, нашыя прадпрыемствы для таго і створаны.

Выставы ж апрыёры неакупляльныя, так паўсюль. Класічнай музыкай, нават якаснай эстрадай — джазам, сябе не акупіць філармонія (а папсой — магчыма). Тое ж з тэатрамі, глыбокай літаратурай.

— Вядома ж, масавае мастацтва карыстаецца попытам, «глыбокае» ў гэтым паказчыку саступае. А вы можаце сказаць, што публіка дзясяткі гадоў таму была разумнейшай?

— У параўнанні з савецкім часам, хоць я не вялікі сімпатызант ідэалогіі тых часоў, дэградацыя відавочная. Тады дамінавалі маральныя нормы, хто ехаў красці дровы, выбіраў сухое дрэва, жывога не сек — бачыце, якая экалагічная культура. А ўзровень разумення мастацтва прыкладна той жа. Іншая справа, што гэтае разуменне павінна выхоўвацца, як літаратура і музыка. Адзін мой маскоўскі калега сказаў, што прыйшоў той час, калі культурай трэба карміць прымусова.

На тое, каб выставіць добрыя карціны, грошай не хопіць, а на мастацтва, дзе распранаюцца і спраўляюць патрэбу на публіку (ёсць такі папулярны Алег Кулік), — хапае.

Зараз амаль не робяцца агляды з выстаў жывапісу, мала пра гэта гаворыцца на тэлебачанні. На кожным канале ёсць ранішняя праграма, дзе заўсёды прысутнічае папса, а галоўная навіна: «яна зняла кліп». Не бачыў, каб запрасілі джазменаў ці некага з опернага тэатра... «Пагодныя навіны» — адкуль такая мова? Чую, як вядучыя агучваюць калькі з рускай.

— Можа, гэта наватвор, як да гэтага ставіцеся?

— Любая мова сябе стварае. Напрыклад, слова «лядоўня» прыдумана гадоў 15-20 таму і ўжо займела сваё месца ў беларускамоўным асяроддзі. Леанід Дранько-Майсюк неяк прыдумаў слова «далькажык» у сэнсе «мабільны тэлефон», якое толькі спрабуе прыжыцца ў моўнай прасторы. Пятро Глебка сказаў «навучэнец» замест «вучашчыйся». Я і сам прыдумляю. Але ж мовы катастрафічна не хапае, мы ёй завінавацілі.

— Як Саюз мастакоў прасоўвае нацыянальную культуру?

— Мы актыўна гэта рабілі заўсёды. У свой час, яшчэ калі «спалі» пісьменнікі, мы паднялі ў грамадскай свядомасці Міколу Гусоўскага, Язэпа Драздовіча, Алену Кіш. Мы праводзілі адукацыйныя выставы, напрыклад, у гонар тысячагоддзя Літвы (не блытаць з рэспублікай Летува).

Беларусы камплексуюць наконт нашай «тутэйшасці» адносна супер-Еўропы — я гэта чую і ад чыноўнікаў. Але не трэба ўсё даганяць, ад нечага наадварот варта ўцякаць. Можа, мы — залаты запас Бога са сваёй простасцю і не ўсё «разбазарылі» з таго, што ім дадзена.

— Год таму былі глабальныя планы па рэстаўрацыі Палаца мастацтваў...

— Каласальныя планы былі, але вайна ва Украіне, санкцыі супраць мажлівага генеральнага інвестара працэс прыпынілі.

— Галоўнае, што пагражае сучаснаму выяўленчаму мастацтву, — гэта безграшоўе?

— І недастатковая ўвага з боку дзяржаўных органаў. Мастакі — людзі, якія працуюць на вечнасць. І дзяржава павінна разумець, што мы яе ў гэтай вечнасці замацоўваем. Калі казаць пра італьянцаў — каго перш за ўсё ўспомняць? Мастакоў. Я ўжо даўно думаю не пра творчасць, а як выратаваць нашу супольнасць. Сёння мастак вымушаны плаціць вялікія грошы за працоўнае месца (апроч матэрыялаў, і на «паесці») — часам да пяці мільёнаў за месяц. Гэта значна болей за пенсію пажылога творцы. Цяпло ў майстэрні мастака каштуе ў дзесяць разоў даражэй, чым у звычайнай кватэры. Да таго ж, кожны з іх удзельнічае ў так званым перакрыжаваным субсідзіраванні, гэта значыць, плацячы за працоўнае месца, вымушаны даплачваць яшчэ за тры-чатыры кватэры. Во, якія мы «багатыя»! Усе творы і выставы з'яўляюцца практычна за свой кошт. Назад сродкі не вяртаюцца, можна сказаць, дабрачынная праца. Трэба ж ганарыцца нашымі творцамі сёння, а не тады, калі іх ужо не будзе.

Таксама пагражае паніжэнне маральных і прафесійных прынцыпаў з боку канцэптуальнага мастацтва. Яно не патрабуе падтрымкі — дастаткова на плоце напісаць тры літары і назваць гэта творам. У Маскве залетась арт-група «Вайна» атрымала прэмію Кандзінскага (40 тысяч еўра) за «мастацкі твор»: на развадным масце ў Санкт-Пецярбургу напісалі тое, што стаіць за трыма папулярнымі літарамі. Мост падняўся... Кандзінскі толькі пра гэта і дбаў...

— Як у колькасным плане сёння прадстаўлена жаночае мастацтва?

— Калі я вучыўся ў тэатральна-мастацкім інстытуце, на жывапісе, графіцы на дзесяць хлопцаў добра калі была адна дзяўчына. Выяўленчае мастацтва лічылася мужчынскай прафесіяй, зараз ім складана зарабіць, таму склалася адваротная сітуацыя. Прэстыж прафесіі ўпаў, таму што яна на выжыванні. У мае студэнцкія часы заказаў было — не спраўляліся. Я зарабляў няблага грошы, у бацькі за пяць гадоў капейкі не ўзяў. А зараз многія, хто скончыў творчую ВНУ, сыходзяць у іншыя прафесіі.

Калі нават суперталенавіты чалавек ідзе вокны ўстаўляць, значыць, не мастак. У творцы прафесійнага толькі пяцьдзясят працэнтаў, астатняе — інтэлектуальныя, маральныя, ідэйныя чыннікі. Я выкладаю ўжо дваццаць пяць гадоў, з калегамі мы з жалем канстатуем, што найлепшыя вучні некуды знікаюць. Я зразумеў: гэта таму што, апроч прафесійных, не хапала тых самых вартасцяў. Вельмі важна, каб у творцы была ідэя, якая не дасць яму кінуць працу ў безграшоўі. Вінсэнт Ван Гог, напрыклад, не прадаў пры жыцці ніводнага твора.

Выставы ж апрыёры неакупляльныя, так паўсюль. Класічнай музыкай, нават якаснай эстрадай — джазам, сябе не акупіць філармонія (а папсой — магчыма). Тое ж з тэатрамі, глыбокай літаратурай.

— Калі вы прыйшлі на пасаду старшыні Саюза мастакоў, казалі пра ўстанаўленне кантактаў з замежнымі калегамі.

— Яны ўсталяваныя з літоўскім Саюзам мастакоў, актыўна супрацоўнічаем з украінскімі і польскімі калегамі: правялі, напрыклад, у Львове выставу «100 мастакоў з Беларусі». Ездзім на пленэры, ладзім персанальныя выставы. Калі нехта з нас выязджае за мяжу — добра разумее, што прадстаўляе сваю краіну і дбае пра тое, як выглядае беларус і разам з ім Беларусь нават на невялічкай лакальнай прасторы.

— У вас хапае часу на творчасць?

— Практычна не. Гэта ж не проста: ёсць дзве гадзіны — пабег памаляваў. Мяне ад творчай дэградацыі ратуе тое, што я, апроч іншага, яшчэ займаюся літаратурай, пішу, друкуюся і шмат чытаю. Ад аднаго паэтычнага радка можа пайсці ток, пра паэзію я гадзінамі магу гаварыць. Жыву гэтым і гэтым ратуюся. Зрэшты, усім раю чытаць, гэта — душэўная гігіена.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ

■ Кніжная паліца

100 ГАДОЎ БЕЗ САМОТЫ

Прыватная справа друкара Кухты

Не, усё ж гэта былі дзіўныя людзі, якія напачатку мінулага стагоддзя здолелі ўзняць беларускую мову, падкрэсліць яе прыгажосць, каштоўнасць, жыццёвасць. Яны ў яе верылі. А здавалася ж, што ўсё страчана. Тым не менш, дастаткова бывае хоць бы аднаго чалавека, які нешта хоча рабіць. І справа жыве. Але калі яна становіцца справай для народа, то гэта зусім іншая гісторыя. Гісторыя пра тое, як адзін прыватны прадпрымальнік здолеў зрабіць вялікую справу для беларускага народа. Яго імя — Марцін Кухта. Сёлета наша краіна (але яшчэ і суседняя Літва) адзначае 140 гадоў з дня нараджэння гэтага чалавека і нагадвае пра яго справу, якая ўжо аднойчы даказала сілу друкаванага слова на роднай мове.

Марцін Кухта, той самы друкар, што выдаў у Вільні «Вянок» Максіма Багдановіча і пра каго ён пісаў у сваім кранальным вершыку: «... Я не самотны, я кнігу маю...»

Кухта-друкар выдаў шмат кніг, але яшчэ і часопісы, газеты. Іх можна пабачыць на выставе ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, прысвечанай выдаўцу пачатку XX стагоддзя, які працягваў праз кнігі высокую справу беларускага асветніцтва. Хоць сам ён пра гэта мог і не думаць (мы не даведаемся, якія матывы ім кіравалі), але атрымліваецца, што добрыя справы заўсёды паўстаюць на глебе шчырасці.

Марцін Кухта сапраўды ўмеў зрабіць так, што кнігі (і наогул друкаваная прадукцыя) станавіліся часткай жыцця. Як жа інакш, для друкара гэта было нават справай гонару. Але не ўзнікла б гэтай яго справы — славутай друкарні ў Вільні, каб ён не адчуў, што трэба скарыстаць момант (можа быць, для сябе самога найперш). Кухта быў па натуры прадпрымальнікам. Папрацаваўшы ў Санкт-Пецярбургу наборшчыкам, засвоіўшы гэты від працы, ён вярнуўся на Радзіму з пэўнай сумай. І не паклаў яе ў куфэрак, а ўклаў у адкрыццё друкарні (разам з Вілейшысам). І калі выходзіць закон у Расійскай імперыі, які здымае абмежаванне на выкарыстанне мясцовых моў у заходніх губернях, то Кухта скарыстоўвае гэты момант для развіцця справы, прычым, на карысць не толькі сабе. У 1906 годзе ён заснаваў у Вільні друкарню, што мела права выпускаць кнігі, газеты і часопісы на ўсіх еўрапейскіх мовах. У тым ліку — на беларускай. Не менш за 60 кніжных выданняў на беларускай мове выдаў Марцін Кухта з 1906 па 1915 гады. Акрамя таго, друкаваў яшчэ і на польскай, і на літоўскай мовах кнігі, газеты і часопісы. Выставу ў гонар віленскага друкара наведалі прадстаўнікі Літоўскай Рэспублікі — у гэтыя дні нашы блізкія суседзі адзначаюць 25-годдзе незалежнасці. Між іншым, справа Марціна Кухты паўплывала на нараджэнне ідэі беларускай незалежнасці.

Выстава складзена з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, дзе прадстаўлены віленскія выданні пачатку XX стагоддзя.

У 1906 годзе ў друкарні Марціна Кухты выходзіць газета «Наша Доля», а потым і «Наша Ніва», якая ў той час стварае ўзор літаратурнай беларускай мовы. Яшчэ і таму, што з выданнем супрацоўнічаюць Янка Купала, Якуб Колас, Максім Багдановіч, Цётка, Алесь Гарун, Змітрок Бядуля, Цішка Гартны — шэраг імёнаў можна працягваць: са старонак газеты прыходзіла слова ўсіх нашых выдатных літаратараў таго часу. І гэта можна пабачыць — арыгіналы першых нумароў «Нашай Нівы», асобнікі «Беларускага календара» (папулярнае выданне ва ўсіх сэнсах, тыраж даходзіў аж да 8 тысяч), славуты «Вянок», які назаўсёды ўпісаў імя Марціна Кухты ў вечнасці. А можа быць, нават калі б не вершык Багдановіча, то ўсё роўна яго захавала б гісторыя: з друкарні выйшаў зборнік Янкі Купалы «А хто там ідзе?», «Кароткая гісторыя Беларусі» Вацлава Ластоўскага (у 1910 годзе), «Родныя з'явы» Якуба Коласа, «Рунь» Максіма Гарэцкага, «Беларуская граматыка для школ» Браніслава Тарашкевіча, «Курганная кветка» Канстанцыі Буйло (у 1914-м). Гэта была не проста друкарня, а месца яднання, кропка ў прасторы, з якой пачыналася сучасная беларуская літаратура. З Кухтам супрацоўнічалі выдавецкая суполка «Наша хата» і «Беларускае выдавецкае таварыства». Ён быў знаёмы з імі, тымі, каго мы называем сёння класікамі, але тады яны ўсе пачыналі, з натхненнем, імпэтам, з жаданнем стварыць Беларусь і дзеля яе. Праўда, пакуль жыла мара пра яе. А яны яшчэ толькі пачыналі звяртацца да людзей і не мелі шырокай вядомасці. А Кухта ўсё роўна супрацоўнічае з імі. Рызыкуе як выдавец (ну, здавалася б, справа амаль бесперспектыўная, чыста ў плане бізнесу). Верыць у іх? Верыць у беларускую мову? У ідэю, якой яны служаць? Ці служыць і сам?..

Кожны чалавек трапляе ў жыцці ў такія абставіны, калі робіць свой выбар. У кагосьці ён грамадзянскі, а ў кагосьці прафесійны, па справе, у кагосьці жыццёвы ці чалавечы. Падаецца, што Марцін Кухта ішоў ад жыцця, ад таго, што на той момант яно прапаноўвала, і гэта неяк спалучалася з яго друкарскай справай. І па жыцці вырашаў праблемы, якія з'яўляліся. Штодня. Паступова. Па меры іх паступлення. А было ж шмат усялякай мітусні, якой можна было пазбегнуць. Чыста чалавечы. Абраць больш спакойны варыянт таго ж самага бізнесу, чым гэтая беларуская справа. Але, можа быць, усё не так, і гэта не людзі выбіраюць справы, а якраз наадварот? І тады насамрэч кропля камень точыць: ёсць жа мы, у руках вось тая літаратурная мова, якую стваралі нашы класікі. Што з ёй рабіць — зноў-такі выбар, які робіць кожны. 100 гадоў прайшло. Але ведаеце, што ў гэтым усім самае аптымістычнае? Наяўнасць выбару.

Шмат думак народзіць агляд выставы, якая складзена з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, дзе прадстаўлены віленскія выданні пачатку XX стагоддзя «з друкарні пана Марціна Кухты». Друкарні, якая існавала ў Вільні 100 гадоў таму і трошкі больш за дзесяцігоддзе (да 1918 года). Сам Марцін Кухта пражыў да 1956-га. Але ўсе ўзгадваюць той час, калі ў яго была справа, адзначаная асаблівым сэнсам: стварацьлітаратуру для цэлага народа.

Ларыса ЦІМОШЫК

УНП 100023492

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ

ОАО «БЕЛНИИЛИТ»

220118, г. Минск, ул. Машиностроителей, 28

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31 декабря 2014 г.

АКТИВЫ	Код строки	На 31 декабря 2014 г.	На 31 декабря 2013 г.
1	2	3	4
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	25 212	25 352
Нематериальные активы	120	5 379	7 369
Доходные вложения в материальные активы	**130**	**12 033**	**12 167**
Вложения в долгосрочные активы	140	921	80
Отложенные налоговые активы	160	151	154
Прочие долгосрочные активы	180	-	-
ИТОГО по разделу I	**190**	**43 696**	**45 122**
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	**210**	**6 950**	**11 940**
Расходы будущих периодов	230	18	517
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	240	24	60
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	6 777	3 792
Денежные средства и их эквиваленты	270	1 603	331
ИТОГО по разделу II	**290**	**15 372**	**16 640**
БАЛАНС (190+290)	**300**	**59 068**	**61 762**
СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА	**Код строки**	**На 31 декабря 2014 г.**	**На 31 декабря 2013 г.**
1	2	3	4
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал	410	24 020	24 020
Резервный капитал	440	251	222
Добавочный капитал	450	20 593	20 683
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	460	5 306	3 933
ИТОГО по разделу III	**490**	**50 170**	**48 858**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Доходы будущих периодов	540	6 100	5 807
ИТОГО по разделу IV	**590**	**6 100**	**5 807**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочная кредиторская задолженность	**630**	**2 798**	**6 970**
Доходы будущих периодов	650	-	127
ИТОГО по разделу V	**690**	**2 798**	**7 097**
БАЛАНС (490+590+690)	**700**	**59 068**	**61 762**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

Наименование показателей	Код строки	За январь–декабрь 2014 г.	За январь–декабрь 2013 г.
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	010	31 523	31 218
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	020	28 997	26 319
Валовая прибыль (010-020)	**030**	**2 526**	**4 899**
Управленческие расходы	040	1 101	1 362
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030-040-050)	**060**	**1 425**	**3 537**
Прочие доходы по текущей деятельности	070	12 417	14 698
Прочие расходы по текущей деятельности	080	14 151	15 703
Прибыль (убыток) от текущей деятельности (060+070-080)	090	-309	2 532
Доходы по инвестиционной деятельности	**100**	**2 725**	**2 084**
Расходы по инвестиционной деятельности	**110**	**668**	**545**
Доходы по финансовой деятельности	**120**	**1 629**	**785**
Расходы по финансовой деятельности	**130**	**973**	**1 133**
Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности (100-110+120-130)	**140**	**2 713**	**1 191**
Прибыль (убыток) до налогообложения (090+140)	**150**	**2 404**	**3 723**
Налог на прибыль	160	524	782
Изменение отложенных налоговых активов	170	-3	-3
Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода)	190	0	-3
Чистая прибыль (убыток) (150-160+170-190-200)	**210**	**1 877**	**2 935**

Директор ОАО «БЕЛНИИЛИТ» **А.П. Мельников**

Главный бухгалтер **Н.В. Ванзонок**

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении 14 апреля 2015 года торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего на праве хозяйственного ведения унитарному предприятию «Поречье Белкоопсоюза»

Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)		
Наименование, характеристики, местонахождение продаваемого имущества, сведения о земельном участке	**Начальная цена с НДС, бел. руб.**	**Размер задатка, бел. руб.**
«А 2/к. Здание детского сада» общей площадью 1083,2 кв. м, инв. номер в ЕГРНИ 500/С-18102, расположенное по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, д. 71Б (назначение: здание специализированное для образования и воспитания; площадь земельного участка – 0,3834 га, кадастровый номер 500000000002001592); забор (ограждение); ворота; калитка; навес теневой (беседка) (4 шт.); сарай (склад).	10 567 351 040	1 056 735 104

Продавец имущества: унитарное предприятие «Поречье Белкоопсоюза», пр-т Победителей, 17, 220004, г. Минск.

Организатор торгов: УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего на праве хозяйственного ведения унитарному предприятию «Поречье Белкоопсоюза», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

